

«ВЯСКОВЫ СУПРЭМАТЫЗМ» МАГІЛЁЎСКАГА МАСТАКА 9

АД ЧАГО ЗАЛЕЖАЦЬ РАЗУМОВЫЯ ЗДОЛЬНАСЦІ? 12





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 ЖНІЎНЯ 2023 г. СУБОТА № 150 (30030)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У 2023/2024 навучальным годзе плануецца задзейнічаць 1,5 тысячы школьных аўтобусаў для падвозу 58 тысяч навучэнцаў, якія жывуць у аддаленых населеных пунктах. Была пастаўлена задача абнавіць парк школьных аўтобусаў — будзе закуплена 275 аўтобусаў, каб з 1 верасня забяспечыць падвоз дзяцей. Таксама ўрадам пільная ўвага надаецца арганізацыі школьнага харчавання. Рэалізаваны пілотны праект у 23 школах краіны. Плануем, што з 1 верасня каля паловы нашых школ пяройдуць на новыя ўмовы харчавання, астатняя частка — да 1 верасня 2024 года».*

II ГУЛЬНІ КРАІН СНД БЕЛАРУСЬ 2023

# НА ТРЫБУНАХ СТАНОВІЦЦА ГУЧНА!

## Падрабязнасці пра спартыўную праграму II Гульняў краін СНД

**Спартсмены доўга рыхтаваліся, трэнеры шмат працавалі, функцыянеры правялі не адзін дзясятак нарад, журналісты спрабавалі рабіць прагнозы... і нарэшце ўсе дачакаліся — II Гульні краін СНД пачынаюцца. Нас чакае цэлы тыдзень спаборніцтваў і перамог. Дакладней, Гульні ўжо пачаліся. У пятніцу праграму мультыспартыўнага форуму адкрылі спаборніцтвы па мастацкай гімнастыцы. А з суботы стартуюць турніры па іншых відах спорту, якіх у праграме 20. Сёння ў «Мінск-Арэне» форуму будзе дадзены афіцыйны старт, цырымонія адкрыцця запланавана на вечар. Усяго з 4 да 14 жніўня за ўзнагароды II Гульняў краін СНД будуць спрачацца 2200 спартсменаў з 22 краін. Беларусь пацвердзіла сваю гасціннасць і зрабіла Гульні адкрытымі для ўсіх. Таму сярод краін-удзельніц — 9 краін з СНД і 14 — з далёкага замежжа. Сіноптыкі абяцаюць, што жнівень будзе гарачы, тое ж абяцае і спорт. Расказваем, дзе і калі кожны жадаючы зможа адчуць спартыўны накал.**




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



### Мастацкая гімнастыка

Звычайна спаборніцтвы грацый закрываюць спартыўныя форумы. Але II Гульні краін СНД вылучаюцца наватарскім падыходам. Таму дзяўчаты задаюць агульны настрой Гульням. Спаборніцтвы прымае Палац мастацкай гімнастыкі ў Мінску з 4 да 6 жніўня. У індывідуальных спаборніцтвах выступаюць сеньёркі, у групавых — юніёркі. Склад удзельніц — зорны. На дыван выйдзе прыма беларускай мастацкай гімнастыкі, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Токіа Аліна Гарнасько. Канкурэнцыю ёй складуць шматразовая чэмпіёнка свету і Еўропы расіянка Арына Аверына, яе суайчынніца трохразовая чэмпіёнка свету сярод юніёраў Лала Крамарэнка.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

### Пляжны футбол

На стадыёне спартыўна-аздараўленчага комплексу «Алімпійскі» сваю гульню пакажа каманда, якая месяц таму прабілася ў фінал чэмпіянату свету. Нацыянальная мужчынская зборная па пляжным футболе пакажаць выдатную гульню ўмее як ніхто іншы. Спаборніцтвы будуць праходзіць з 5 да 9 жніўня, удзел у іх возьмуць каманды Беларусі, Азербайджана, Ірана, ААЭ, Расіі, Узбекістана, Амана і Егіпта. Па выніках лёсавання гаспадары ўвайшлі ў групу А разам з прадстаўнікамі Азербайджана, Ірана і ААЭ. Яркія матчы абяцаюць паказаць і футбалісты расійскай зборнай — трохразовыя чэмпіёны свету. СТАР. 4

## КОРАТКА

- **Больш за 35 тысяч украінскіх грамадзян прыбыло ў Беларусь з пачатку года.**
- Цэны амаль на ўсе каштоўныя металы, што скупляюцца ў фізічных асоб, павялічваюцца з 4 жніўня.
- **У ліпені фонд свідравін кампаніі «Беларуснафта» папоўніўся чатырма новымі аб'ектамі.**



- У РНПЦ дзіцячай хірургіі кардыяхірургі імплантавалі штучны жалудачак сэрца чатырохгадовай мінчанцы.
- **Летне-асенні сезон палявання на птушыную дзічыну адкрыецца 12 жніўня.**


ISSN 1990 — 763X

23150>


Жніво-2023

# СТРАТЭГІЯ ПОСПЕХУ

## Як карэкціруе ўборачную кампанію Гродзенскі раён, дзе ўраджайнасць дасягае 80 цэнтнераў з гектара

**У раёне ўбрана 55 % плошчы. На ўраджай тут не наракаюць. Ён атрымаўся не горшы за леташні. І хоць надвор'е, як водзіцца, уносіць свае карэктывы, аграрыі раёна ўпэўнена трымаюць высокую планку. Пра тое, як цяпер складваецца сітуацыя на палях аднаго з самых паспяховых раёнаў краіны, расказаў карэспандэнту «Звязды» першы намеснік старшыні Гродзенскага райвыканкама, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Віктар КЕМЯЖУК.**

З яго слоў, з-за складаных кліматычных умоў сёлетнюю ўборку прыходзіцца разбіваць нават у дзень на некалькі этапаў. Маніторынг надвор'я ідзе няспынна, камбайны знаходзяцца ў пастаяннай гатоўнасці. Аграрыі стараюцца выкарыстаць кожную спрыяльную хвіліну. Важнае месца займаюць культура земляробства і дысцыпліна вытворчасці. Менавіта гэта дае высокія паказчыкі на жніве. СТАР. 3



Фота Мікалая ЛАПІНА.

Працоўны семестр

# ТРАКТАРАБУДАЎНІК — ГЭТА ГУЧЫЦЬ!

## Стаць ім хоць на дзень можа нават намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта

**Мінскі трактарны завод — вытворчасць, на якой працуе больш за 16 тысяч чалавек. Знаходзіцца работа і для байцоў студатрадаў — ужо другі год яны працуюць тут у рамках рэспубліканскага міжпрофільнага працоўнага праекта «Трактарабудаўнік».**



Учора разам з моладдзю на канвееры працаваў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ,** узяўшы ўдзел у акцыі БРСМ «Адзін дзень у атрадзе». Праект «Адзін дзень у атрадзе» стартаваў 1 жніўня з нагоды 60-годдзя беларускіх студэнцкіх атрадаў. Ён рэалізоўваецца ва ўсіх рэгіёнах краіны з удзелам кіраўнікоў міністэрстваў, ведамстваў, прадпрыемстваў, якія часова мяняюць свае штодзённыя абавязкі на работу ў студэнцкім атрадзе: сустракаюцца з байцамі студатрадаў, разам працуюць, сябруюць і абмяркоўваюць надзённыя пытанні, у тым ліку развіцця студатрадаўскага руху.

Працавалі (вядома ж, пасля інструктажу па ахове працы) на 8-м участку канвеера зборкі трактароў. Тут выконваюцца тэхналагічныя аперацыі па зборцы мадэлі BELARUS-2022: устаноўка радыятара ахалоджвання, падключэнне генератара і датчыкаў кіравання рухавіком, далучэнне тросаў кіравання гідрасістэмы трактара і ўстаноўка сігналізатара задняга ходу, устаноўка рулявога кола.

— Работа, вядома ж, няпростая, але ўмовы створаны добрыя. І прыемна, што рабяты пасля першага курса прыйшлі сёння працаваць на Мінскі трактарны завод. Для іх гэта вельмі добрая школа. І павінен сказаць, што водгукі ў настаўнікаў нядрэнныя. Яны сведчаць пра тое, што людзі матываваны, прыйшлі не проста так паглядзець, а рэальна папрацаваць, унесці свой уклад, — сказаў Ігар Луцкі. — Студатрад — гэта хутчэй не пра заробак, а пра тое, як адчуць рэальную працу, што такое чалавек працы і што такое калектыў. Гэта вельмі важна для сацыяльнага развіцця грамадзяніна. Працаваць заўсёды было важна, і тое не толькі моладзі датычыцца. Гэта ўсіх нас датычыцца. На сваім працоўным месцы кожны павінен рабіць тое, што ўмее, як мага лепш, і тады ўсё будзе добра. А тут яркі прыклад працы стваральнай, калі на выхадзе з канвеера атрымліваецца рэальны прадукт.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта ў свой час таксама працаваў у студатрадах.

— Мы тады працавалі ў Ніжнявартаўску. Гэта былі будаўнічыя атрады, выязджалі на два месяцы ў Ханты-Мансійскую аўтаномную акругу, — падзяліўся ўспамінамі Ігар Луцкі. — Шчыра кажучы, мы ехалі па рамантыку. Мне здаецца, тыя хлопцы, у якіх няма такіх успамінаў, трохі нешта ў жыцці губляюць. Таму я кожнаму б рэкамендаваў сябе паспрабаваць у студатрадаўскім руху. Гэта крута.

Падчас наведвання МТЗ Ігар Луцкі азнаёміўся з работай байцоў «Трактарабудаўніка-2023». Напрыклад, удзельнікі студэнцкага атрада «Лідар» імя Героя Савецкага Саюза М. В. Аўдзеева, якія ў вольны ад вучобы час у рамках адукацыйнага праекта «Школа БСА» прайшлі кароткатэрміновае практыка-арыентаванае сертыфікаванае навучанне па рабочых прафесіях, падзяліліся меркаваннем аб тым, якія магчымасці пры заключэнні дагавораў на работу адкрылі пасведчанні з прысваеннем разраду. Важны складнік праграмы — адкрыты дыялог «Глядзім у будучыню».

**Намеснік генеральнага дырэктара ААТ «МТЗ» па ідэалагічнай рабоце і сацыяльным развіцці Уладзімір ПІСКІЖАЎ** станоўча ацаніў рэспубліканскі міжпрофільны працоўны праект «Трактарабудаўнік».

— Дадзены праект маштабна ажыццяўляецца другі год. Летась мы прымалі студатрады — больш за сто байцоў. Сёлета некаторыя студэнты ўжо працуюць паўторна. Цяпер на трактарным заводзе ў цэлым прымаем 157 чалавек. Гэта не толькі на асноўнай вытворчасці. Яшчэ і сэрвісныя атрады, якія працуюць у грамадскім харчаванні, педагагічныя атрады ў дзіцячых аздараўленчых лагерах, — распавёў намеснік гендырэктара.

Ён мяркуе, што дапамога байцоў студатрадаў істотная.

— Мы ім давяраем адказную работу. Майстры, якія працуюць з імі, убачылі патэнцыяльных работнікаў завода. Многія выказваюць сваё задавальненне ад працэсу і выніку. Гэты вынік — на выхадзе канвеера. Гэта наш гонар — нашы трактары, — адзначыў Уладзімір Піскіжаў. — Першыя дні хлопцы працуюць з майстрамі, настаўнікамі. Але праходзіць тры-чатыры, максімум пяць дзён, і яны нароўні з пастаянна працуючым персаналам выконваюць аперацыі якасна і, самае галоўнае, ва ўстаноўлены тэрмін. Рабяты спраўляюцца добра, выконваюць норму і зарабляюць добрыя грошы. Задаволеныя і мы, і яны. Многія ўжо цяпер выказваюць жаданне прыйсці да нас працаваць далей.

Намеснік гендырэктара ўдакладніў, што заробак на асноўнай вытворчасці на канвееры ў байцоў студатрадаў не меншы за адну тысячу рублёў.

Сёлета рабочую спецыяльнасць атрымала на курсах каля трохсот студэнтаў ВНУ. Пра гэта паведаміў журналістам **другі сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандр ПРОХАРАЎ:**

— Па ініцыятыве моладзі мы рэалізавалі праект па арганізацыі кароткатэрміновых практыка-арыентаваных курсаў па рабочых спецыяльнасцях. Рабяты ў вольны ад вучобы час змаглі атрымаць дадатковую рабочую спецыяльнасць. Пілотны праект мы запусцілі сёлета. Каля 300 чалавек ужо атрымала рабочую спецыяльнасць: слесар механазборачных работ, аператар станкоў з праграмным кіраваннем, праваднік пасажырскага вагона і манцёр пуцей. Гэта дазваляе хлопцам і дзяўчатам выконваць больш складаныя віды работы і больш зарабляць.

Паводле яго слоў, праект па арганізацыі кароткатэрміновых практыка-арыентаваных курсаў па рабочых спецыяльнасцях будзе працягвацца, а іх спектр — пашырацца.

— Калі ў 2021 годзе было 34 тысячы працаўладкаваных, у 2022-м — 42,5 тысячы, сёння — звыш 30 тысяч працаўладкавана ў складзе студатрадаў. Больш за тое, пашыраецца пералік прымаючых арганізацый. Усё больш аб'ектаў выдзяляецца для работы студатрадаў. І трэба адзначыць, што моладзі давяраюць важныя ўчасткі, як і сёння на МТЗ.

**Камандзір рэспубліканскага міжпрофільнага працоўнага праекта «Трактарабудаўнік-2023» Уладзіслаў ТКОРАЎ** расказаў журналістам, што многія ўдзельнікі праекта мараць атрымаць размеркаванне на МТЗ. Ён ужо другі год працуе камандзірам на праекце.

— Зыходзячы з мінулага года і дасягненняў байцоў, завод быў вельмі рады прыняць праект зноў, — адзначыў Уладзіслаў. — Сёлета на праекце працуе 101 чалавек. З іх 13 — расіян. Ёсць хлопцы, якія ўжо другі год працуюць на МТЗ, таму яны хутка ўваходзяць у працоўны рэжым. Зарплата добрая. Акрамя таго, для рабят арганізавана харчаванне, выдаецца спецвопратка і сродкі індывідуальнай аховы. За імі замацаваныя настаўнікі, якія іх навучаюць на працоўным месцы і заўсёды гатовыя падказаць і дапамагчы.

Па сканчэнні месяца магу сказаць, што больш за палову хлопцаў выйшла на тыя рабочыя аб'ёмы, з якімі спраўляюцца асноўныя работнікі завода. А значыць, яны вельмі хутка ўвайшлі ў тэмп.

Паводле яго слоў, моладзі падабаецца працаваць на МТЗ.

— Для іх гэта выдатная магчымасць у тым ліку і для будучага размеркавання пасля заканчэння вышэйшых навучальных устаноў, — дапоўніў Уладзіслаў Ткораў.

Працуюць байцы праекта на МТЗ у дзве змены: з 7.00 да 15.20 і з 15.20 да 23.40. Акрамя работы на канвееры, частка ўдзельнікаў праекта працуе будаўнікамі, а таксама на камбінаце грамадскага харчавання прадпрыемства на кухні. Вольны ад работы час арганізаваны з карысцю — рабяты наведваюць сталічныя тэатры і кінатэатры, музеі, футбольныя матчы, удзельнічаюць у спартыўных спаборніцтвах паміж атрадамі.

Многім падабаецца працаваць на заводзе. Так, напрыклад, Алмаз Адзіятулін прыехаў на МТЗ з Татарстана, ён сёлета пераходзіць на 3-і курс Казанскага аграрнага ўніверсітэта.

— Тут я выконваю зборку трактароў. Аб праекце даведаўся ад свайго студэнцкага атрада. Нам прапанавалі папрацаваць на Мінскім трактарным заводзе. Было цікава пабываць у сталіцы, убачыць Беларусь, даведацца пра мясцовыя традыцыі. Аб вашай краіне склаліся станоўчыя ўражанні. У першы дзень працаваў пад наглядам куратара. Ужо на наступны дзень стаў працаваць самастойна. Работа па сутнасці нескладаная. На заводзе я шмат з кім пасябраваў.

Апрабаваўшы ў 2022 годзе пляцоўку для работы студэнцкіх атрадаў на Мінскім трактарным заводзе, у красавіку бягучага года БРСМ і МТЗ заключылі пагадненне аб супрацоўніцтве. Сёння працоўны праект «Трактарабудаўнік-2023» аб'ядноўвае больш за сто байцоў у складзе васьмі лінейных студэнцкіх вытворчых, будаўнічых і сэрвісных атрадаў. Усе атрады сфарміраваныя на конкурснай аснове ва ўстановах вышэйшай адукацыі Беларусі і Расіі. Міжпрофільны працоўны праект будзе праходзіць да 23 жніўня.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЗША расце колькасць парушэнняў, звязаных з выкарыстаннем дзіцячай працы



Большасць парушэнняў звязаная з тым, што дзеці працуюць даўжэй, чым дазволена, паведаміў тэлеканал CNN. У той жа час некаторыя вядомыя кампаніі былі абвінавачаны ў тым, што наймалі дзяцей на цяжкую работу ў небяспечных умовах. Так, паводле звестак Міністэрства працы ЗША, у штаце Небраска 14-гадовы падлетак, які чысціў мясарубкі, неаднаразова атрымліваў хімічныя апёкі падчас работы з 2021-га да 2022 года. Іншы 13-гадовы падлетак атрымліваў моцныя апёкі ад мыйных сродкаў. У 16 франчайзінгавых рэстаранах McDonald's у Луізіяне і Тэхасе 14-гадовыя падлеткі дапазна працавалі на небяспечным абсталяванні. А ў штаце Кентукі раней быў зафіксаваны выпадак, калі двое 10-гадовых дзяцей працавалі бясплатна да двзюх гадзін ночы, гатуючы і падаючы ежу, а таксама прыбіраючы памяшканні. І такіх выпадкаў даволі шмат, паведамляе тэлеканал.

### У Бразіліі больш за 40 чалавек загінула падчас рэйдаў супраць наркамафіі



У выніку рэйдаў, якія правяла паліцыя Бразіліі супраць наркагандляроў у трох штатах краіны, загінула сама меней 43 чалавекі, паведаміла «Бі-бі-сі». Падчас аперацый у фавэлах Рыа-дэ-Жанейра, паводле звестак улад, паліцэйскім прыйшлося адкрыць агонь у адказ. У перастрэлцы загінулі дзесяць чалавек. Яшчэ 14 чалавек былі забітыя ў выніку сутыкненняў падчас пяцідзённай паліцэйскай аперацыі «Шчыт» у штаце Сан-Паўлу. Улады паўночна-ўсходняга штата Баія заявілі аб гібелі 19 чалавек, якія падазраюцца ў гандлі наркотыкамі. Акрамя таго, паліцыя арыштавала 58 чалавек у штаце Сан-Паўлу, пасля таго як у прыморскім горадзе Гуаружа быў забіты супрацоўнік паліцэйскага спецназа. Па паведамленнях бразільскіх СМІ, падчас аперацый былі канфіскаваны 385 кілаграмаў наркотыкаў і зброя.

### У Калумбіі пачаў дзейнічаць рэжым спынення агню паміж паўстанцамі і ўрадам



Урад Калумбіі і паўстанцкая групоўка «Армія нацыянальнага вызвалення» (АНВ) пацвердзілі пачатак дзеяння рэжыму двухбаковага спынення агню, паведаміла ТАСС. «Пачынаецца спыненне агню з вельмі надзейным механізмам праверкі. А самае галоўнае, што ёсць воля абодвух бакоў захоўваць яго», — сказаў адзін з лідараў АНВ Пабла Бельтран на цырымоніі, прысвечанай пачатку работы Нацыянальнага камітэта ўдзелу, створанага ўрадам Калумбіі для вырашэння рознагалоссяў унутры краіны. Бельтран прызнаў, што «ёсць тыя, хто не ахоплены рэжымам спынення агню». Як удакладніў міністр нацыянальнай абароны Калумбіі Іван Веласкес, рэжым спынення агню мае на ўвазе прыпыненне «аперацый, накіраваных на ўзброенае сутыкненне з незаконнай арганізацыяй». У той жа час ваенныя і паліцэйскія прадоўжаць выконваць задачы па забеспячэнні бяспекі і праследаванні злачынцаў.

# СТРАТЭГІЯ ПОСПЕХУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Структура плошчы ў асноўным сфарміравана і мяняецца з улікам попыту на рынку і спецыфікі гаспадаркі. Напрыклад, там, дзе стаўка робіцца на жывёлагадоўлю, падбіраюцца і адпаведныя кармавыя збожжавыя культуры. Пры развіцці свінаводства і птушкаводства ўвага — на ячмень, пшаніцу, кукурузу, бялковыя культуры. Ёсць гаспадарка, дзе значная плошча адведзена пад сою.



Вясновая і летняя засуха закранула ўсе гаспадаркі раёна. І ўсё ж як наступствы ўдалося значна зменшыць праз прымяненне адпаведных агратэхнічных прыёмаў, у прыватнасці, унясеннем угнаенняў дробным метадам, гэта значыць патроху, але некалькі разоў. Такім чынам падкормка раслін вялася не 1-2 разы, як было раней, а 3-4. А мінеральныя ўгнаенні садзейнічаюць утрыманню вільгаці. Гаспадаркі раёна зрабілі ўсё, каб захаваць ураджай.

— Цалкам згодны з Прэзідэнтам, які падчас наведвання Бераставіцкага раёна звярнуў увагу на раннія азімыя культуры — рапс і ячмень. Яны даюць большую аддачу, чым яравыя, менавіта з-за засухі. Мы ўжо ідзём у гэтым напрамку. Сёлета атрымалі вельмі добры ўраджай азімага рапсу. Нашы гаспадаркі не толькі ўдасканальваюцца ў тэхналагічным плане, але кожны год вывучаюць найбольш выгадныя сарты і гібрыды раслін. Спецыялісты аналізуюць іх ураджайнасць, устойлівасць, тэрміны паспявання. Тое ж самае па збожжавых і іншых культурах. І ўжо пры набыцці насення для наступнага года яны бачаць, якія сарты ім патрэбныя. Гэта таксама спрыяе высокім ураджаям, — адзначыў Віктар Кемяжук.

Важным аспектам з'яўляецца і наяўнасць уласнага насеннага фонду. Дарэчы, дадзеная праблема таксама ўзнімалася Прэзідэнтам у паездцы ў Гродзенскую вобласць. Многія гаспадаркі карыстаюцца беларускімі сартамі, асабліва ў сіласным кірунку, а вось патэнцыял збожжа і кукурузы трэба ўдасканальваць.

— Высокатэхналагічныя гаспадаркі могуць сабе дазволіць купіць імпартнае насенне. Але гэта яшчэ і пытанне дзяржаўнай бяспекі. Сёння такі продаж ідзе, а заўтра можа і спыніцца ў выніку розных прычын. Таму патрэбная ўласная альтэрнатыва. У рэгіёне трывала развіваецца ўласная база насенняводства, але пры нашай высокатэхналагічнай вытворчасці раёну патрэбныя менавіта высокапрадукцыйныя сарты, бо калі не будзе ў нас свайго насенняводства, будзем і надалей залежаць ад знешніх рынкаў, — падкрэсліў кіраўнік сельскагаспадарчага комплексу раёна.

Такім чынам, ураджай, які вырошчваецца на палях, мае важнае стратэгічнае значэнне. Дзякуючы яму гаспадаркі могуць палепшыць свой вытворчы патэнцыял і развівацца. Вядома, яны маюць права распараджацца сваім ураджаем, лішкі могуць прадаць. Але павінны быць выкананыя галоўныя патрабаванні — забяспечыць фуражным зернем жывёлагадоўлю, свае патрэбы, залажыць насенны фонд і здаць дзяржаўны заказ. Праўда, сёлета цана на яго знізілася з-за паніжанага ўтрымання клейкавіны. Здаць дзяржаве раён павінен амаль 26 тысяч тон збожжа.

Уборачная кампанія пакуль у сярэдзіне свайго шляху. Убрана 55 % плошчы збожжавых і зернебабовых культур. Ураджайнасць на 4 жніўня складае 80 ц/га. Гэта крыху ніжэй, чым летась, але нязначна. Сабрана 127 тысяч тон зерня. У раёне на сённяшні дзень некалькі гаспадарак збірае больш за 100 ц/га ці набліжаецца да таго.

Самы высокі намалот у СВК імя В. Крамко — 106,8 ц/га. Гаспадарка — адзін з кітоў сельскагаспадарчай вытворчасці не толькі раёна, але і вобласці. Тут вельмі добра ведаюць, што такое эканамічная выгада, і крочаць у гэтым кірунку. Напрыклад, выбралі стратэгію ўборкі з мінімумам сушкі. Аказваецца, пры механічнай сушцы губляецца частка бялку, што адбіваецца на кармленні жывёлы, таму гаспадаркі чакаюць кожную хвіліну, каб узяць гатовае збожжа з поля.

Трэба сказаць, аграрыі з вялікім энтузіязмам успрынялі прагноз на найбліжэйшыя дні, калі мяркуецца гарачае надвор'е. «Мы гэтым скарыстаемся ў поўнай ступені, — запэўніў Віктар Кемяжук. — Усе скіраваны на працу. Механізатары працуюць на поўную сілу. Яшчэ чатыры-пяць дзён такога надвор'я, і ўсё зерне апынецца на складах».

Дарэчы, у раёне ўжо ёсць камбайнер, які намалаціў тры тысячы тон зерня, 14 чалавек перавысілі дзве тысячы тон. Ёсць прагнозы ў раёне мець і свайго камбайнера-пяцітысячніка.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Фота Мікалая ЛАПІНА.**

Транспарт

# Пасажырскія перавозкі: ідучы ў нагу з часам

**Ва ўсіх рэгіёнах Беларусі яны — адна з самых развітых галін. У краіне створана і функцыянуе мноства транспартных кампаній, якія гатовыя да штодзённых нагрузак. Разам з тым беларускія перавозчыкі могуць своечасова ўкараняць новаўвядзенні для паляпшэння і адаптацыі галіны да новых патрабаванняў і ўмоў, ідучы ў нагу з часам. Пра тое, як гэта адбываецца, ішла гаворка на прэс-канферэнцыі «Сапраўднасць і будучае пасажырскіх перавозак у Беларусі».**



## Метрапалітэн — асноўная транспартная артэрыя

На долю мінскага метро прыпадае 37 працэнтаў гарадскіх перавозак пасажырскім транспартам. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі «Сучаснасць і будучае пасажырскіх перавозак у Беларусі» **дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Сталічны транспарт і сувязь» Юрый СУПРАНОВІЧ.**

Паводле яго слоў, на сёння функцыянуе 312 маршрутаў гарадскога наземнага транспарту. Працягласць сеткі горада складае 3279 кіламетраў. Таксама ў Мінску ёсць каля 2080 прыпыначных пунктаў, на 514 з іх устаноўлена інфармацыйнае табло.

Метрапалітэн — асноўная транспартная артэрыя. На дадзены момант работа арганізавана па трох лініях, у час пік працуе 316 вагонаў метро. А канцэпцыя развіцця горада настроеная на падвоз пасажыраў да станцый метро наземным транспартам.

Гаворачы аб пасажыраабароце, ён адзначыў рост у параўнанні з мінулымі гадамі — прыкладна на 5,2 працэнта. Асноўную частку перавозіць метрапалітэн — больш за 37 працэнтаў, на долю аўтобусаў прыпадае 34 працэнты. Паводле слоў Юрыя Супрановіча, у 2023 годзе прадпрыемствам арганізавана работа чатырох новых маршрутаў.

Адказваючы на пытанне, ці будзе павышэнне тарыфаў на праезд у грамадскім транспарце Мінска, Юрый Супрановіч растлумачыў: «Трэба разумець, што кошт праязнога білета не пакрывае расходы на абслугоўванне транспарту. Датацыя ад дзяржавы вялікая, нагрузка на бюджэт Мінска даволі важкая. Каб своечасова абнаўляць парк, павышаць якасць абслугоўвання, лагічна павышаць кошт праезду. Аднак, разумеючы сацыяльную значнасць пытання, усё гэта доўга прапрацоўваецца, узгадняецца з прафсаюзамі, з калектывамі. На цяперашні момант павышэння не будзе».

## Адзіны праязны і перспектыўныя электробусы

Для гарадскога наземнага транспарту адзіны праязны з'явіцца ў Мінску да верасня. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» Віктар ТОЗІК.**

«Сёння налічваецца 180 відаў праязных дакументаў, з укараненнем адзінага праязнога іх застанецца 26», — сказаў ён. Паводле яго слоў, найперш тое зручна для пасажыраў: «З увядзеннем адзінага праязнога яны на працягу дня змогуць зрабіць любую колькасць перасадак, не чакаючы свой від транспарту».

Таксама намеснік гендырэктара адзначыў, што ў перспектыве прыярытэт будзе аддавацца развіццю электратранспарту. «Сёння на прадпрыемстве налічваецца 93 электробусы, з іх 23 мы набылі сёлета і ў мінулым годзе. Гэта электробусы з павялічаным аўтаномным ходам да 140 кіламетраў. За такім транспартам будучыня. У далейшым павелічэнне аўтаномнага ходу дасць магчымасць выкарыстоўваць такі від транспарту ў прыгарадных перавозках», — сказаў Віктар Тозік.

Штодзень «Мінсктранс» перавозіць каля аднаго мільёна пасажыраў. «Мы знаходзімся на другім месцы пасля метрапалітэна і ажыццяўляем 34 працэнты пасажырскіх перавозак», — дадаў ён.

## «Белавія» пашырыла маршрутную сетку палётаў

Авіякампанія адкрые новыя рэйсы ў Дэлі і Абу-Дабі. Аб гэтым паведаміла **начальнік аддзела развіцця маршрутнай сеткі і камерцыйнага супрацоўніцтва авіякампаніі «Белавія» Наталля СЕМЯНЧУК.**

Цяпер «Белавія» выконвае рэгулярныя рэйсы ў дзевяць краін (у 20 аэрапортаў), а таксама чартарныя перавозкі. Нягледзячы на знешні ціск, авіякампанія працягвае развіваць маршрутную сетку. «У мае гэтага года мы адкрылі новы рэгулярны рэйс у Мурманск. Да канца года адкрыем яшчэ два новыя напрамкі. У прыватнасці, з 11 жніўня пачынаем рэгулярныя рэйсы ў Дэлі. Гэта абсалютна новы напрамак для Беларусі, вельмі перспектыўны. Палёты пачнём з частаты адзін раз у тыдзень, але ўжо з 20 верасня павялічым да двух рэйсаў», — паведаміла Наталля Семянчук.

З 3 кастрычніка авіякампанія пашырыць праграму палётаў у Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. «У дадатак да рэйсаў, якія цяпер ужо выконваюцца ў Дубай і Шарджу, мы будзем лятаць у Абу-Дабі. Пачнём з аднаго рэйса ў тыдзень, а з 4 лістапада павялічым частату да двух рэйсаў», — дадала Наталля Семянчук. Што датычыцца чартарных перавозак, то авіякампанія ў бягучым годзе пачала выконваць чартарныя рэйсы ў Доху.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВЫСТАЎКА ДА ЮБІЛЕЮ СТУДАТРАДАЎ

**У цэнтры сталіцы адкрылася выстаўка, прысвечаная 60-годдзю беларускіх студэнцкіх атрадаў. Экспазіцыя размясцілася на Нямізе каля гандлёвага цэнтра «Галерэя». Выставачныя стэнды знаёмяць ахвотных з асноўнымі вехамі развіцця студатрадаўскага руху ў Беларусі.**

Галоўнымі героямі плакатаў сталі хлопцы і дзяўчаты, якія працавалі ў складзе найлепшых студэнцкіх атрадаў. Фотавыстаўка стала падарункам да 60-годдзя БСА, расказаў **другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ПРОХАРАЎ.**

— Выдатна, што па ініцыятыве моладзі, байцоў студэнцкіх атрадаў адкрылася фотавыстаўка, якая расскажа жыхарам і гасцям Мінска аб асноўных этапах развіцця беларускага студатрадаўскага руху. Далі слова і самім байцам, якія кажуць аб яго важнасці і значнасці, дзеляцца сваімі ўражаннямі аб рабоце ў студатрадзе. І магу запэўніць, што гэта толькі пачатак. У далейшым плануем яе абнаўляць. У прыватнасці, восенню з'явіцца новая экспазіцыя, прысвечаная аб'ектам, пабудаваным з удзелам студатрадаў.

Фотавыстаўка — гэта яшчэ адна магчымасць расказаць хлопцам і дзяўчатам аб студэнцкіх атрадах і той каласальнай падтрымцы з боку дзяржавы, якая аказваецца моладзі, дадаў Аляксандр Прохараў.

— Тут таксама ёсць QR-код, які накіроўвае на старонку, дзе можна запоўніць анкету і падаць заяўку на ўдзел у студатрадзе, — адзначыў ён.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НА ТРЫБУНАХ СТАНОВІЦЦА ГУЧНА!

## Лёгкая атлетыка

Ніводны буйны форум не праходзіць без каралевы спорту. Спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы з 5 да 8 жніўня будуць прымаць знакавыя аб'екты — Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі зборных кідальнікаў, а Нацыянальны алімпійскі стадыён «Дынама» прыме ўсе іншыя дысцыпліны. У лёгкаатлетычнай праграме II Гульняў краін СНД возьмуць удзел спартсмены з дзевяці краін: Азербайджан, Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Расія, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан. У склад беларускай каманды ўвайшлі 57 лёгкаатлетаў 2009—2010 гадоў нараджэння. Яшчэ дзесяць спартсменаў возьмуць удзел у Гульнях у асабістым заліку. У Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі адзначаюць, што ў большасці відаў барацьба будзе разгортвацца менавіта паміж расійскай і беларускай зборнымі.

## Міні-футбол

Гэта зусім не «малодшы брат» вялікага футбола, а самастойны спорт, якому варта ўдзяліць увагу і завітаць на трыбуны Палаца спорту «Уручча», што ў Мінску. Тут за медалі II Гульняў краін СНД будуць спрачацца пяць камандаў — Беларусі, Азербайджана, Расіі, Узбекістана і Кыргызстана. З 7 да 12 жніўня зборныя правядуць аднакалавы турнір, па выніках якога і вызначыцца пераможца. Гуляць у міні-футбол будуць спартсмены 2004—2006 гадоў нараджэння.

## Стральба кулявая

Гісторыя амаль паўтараецца. Летам 2019 года ў спартыўна-стралковым комплексе імя Цімашэнкі праходзілі спаборніцтвы па кулявой стральбе ў рамках II Еўрапейскіх гульняў. Летам 2023-га, а дакладней, з 6 да 10 жніўня, тут будуць разыграны медалі па кулявой стральбе ў рамках II Гульняў краін СНД. Стралкі да 21 года з Беларусі, Расіі, Казахстана, Кыргызстана, Туркменістана, Азербайджана, Арменіі, Узбекістана і Таджыкістана разыграюць 36 камплектаў медалёў.

## Сучаснае пяціборства

Не забываем, што II Гульні краін СНД — спаборніцтвы адметныя, таму і рыцары пяці якасцяў у Мінску будуць выступаць толькі ў чатырох дысцыплінах: фехтаванні, плаванні і бегу са стральбой. Ад канкура на гэты раз адмовіліся. Але лічба «пяць» у пяціборстве застанецца. Спартсмены 2004 года нараджэння разыграюць пяць камплектаў узнагарод: у індывідуальных спаборніцтвах і эстафетах сярод юнакоў і дзяўчат, а таксама ў змешанай эстафеце. З 8 да 13 жніўня турнір прыме Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Баскетбол 3х3

Дынамічны і яркі від баскетбола даўно пакарыў сэрцы маладых спартсменаў і замацаваўся ў праграмах мультыспартыўных форумаў. У Мінску спаборніцтвы па баскетболе 3х3 пройдуць на беразе Свіслачы, на пляцоўцы «Palova-Арэны». Гэта ўнікальны аб'ект, аналагаў якому няма на постсавецкай прасторы і якіх вельмі мала ў свеце. За медалі ў маладым відзе спорту будуць спаборнічаць яго равеснікі — спартсмены да 20 гадоў. У жаночым турніры выступяць «Беларусь-1», «Беларусь-2», Узбекістан, Казахстан, Кыргызстан. У мужчынскім — «Беларусь-1», «Беларусь-2», Расія, Узбекістан, Туркменістан, Таджыкістан, Кыргызстан, Казахстан. Баскетбол 3х3 хуткі і дынамічны, таму і спаборніцтвы па ім будуць такія ж і пройдуць у два дні — 11 і 12 жніўня.

## Валейбол

Уявіць вялікае спартыўнае мерапрыемства без спаборніцтваў у сталічным Палацы спорту немагчыма. У рамках II Гульняў краін СНД славутасць прыме спаборніцтвы валейбалістаў. Мяч над сеткай будзе лунаць і ў «Чыжоўка-Арэне». Медалі разыграюць юніёры да 20 гадоў з Беларусі, Расіі, Арменіі, ААЭ, Таджыкістана і Узбекістана. У жаночым турніры выступяць спартсменкі да 15 гадоў з Беларусі, Арменіі, Таджыкістана, Расіі і Казахстана. Даты правядзення спаборніцтваў — з 8 да 13 жніўня.

## Бокс

Лядовая арэна Оршы з 6 да 12 жніўня стане домам для баксёраў. Тут свае сілы пакажуць спартсмены 2005—2006 гадоў нараджэння, якія разыграюць узнагароды ў 12 вагавых катэгорыях у дзяўчат і 13 — у мужчын. Віцебшчына наогул — гэта баксёрская мека. У гэтым краі нарадзіліся адзіны ў гісторыі беларускага спорту алімпійскі чэмпіён Вячаслаў Яноўскі і сярэбраны прызёр Алімпіяды Віктар Зуеў. II Гульні краін СНД стануць прыгожым працягам традыцый.

## Тайландскі бокс

Яшчэ адзін прыклад таго, што II Гульні краін СНД — пляцоўка для спартыўных эксперыментаў. Ніколі ў гісторыі на сцэне Летняга амфітэатра не праводзілася спартыўных спаборніцтваў. Тайландскі бокс стаў першапраходцам. На легендарнай сцэне, дзе цяпер устаноўлены рынгі, з 9 да 13 жніўня хлопцы 17—24 гадоў разыграюць узнагароды ў дзесяці вагавых катэгорыях, а дзяўчаты 17—20 гадоў — у чатырох катэгорыях. Важна, што старт паядынкаў у 17.00 — арганізатары абяцаюць шоу.

## Плаванне

Амаль усе нацыянальныя рэкорды і некалькі сусветных рэкордаў былі ўсталяваны на вадзе Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па водных відах спорту. Таму правядзенне спаборніцтваў па плаванні ў рамках II Гульняў краін СНД менавіта ў тым комплексе — цалкам апраўданае. Усяго з 10 да 13 жніўня спартсмены разыграюць 15 камплектаў узнагарод у індывідуальных спаборніцтвах і яшчэ два ў эстафеце. У мужчынскіх спаборніцтвах выступяць юніёры 2007—2008 гадоў нараджэння і юніёркі 2008—2009 гадоў нараджэння.

## Гандбол

Брэст даўно ахрысцілі гандбольнай сталіцай Беларусі. Падзякаваць за гэта ён можа мясцоваму клубу БГК «Мяшкоў». Свой высокі статус горад над Бугам пацвердзіць з 5 да 9 жніўня, калі на пляцоўцы Палаца спорту «Вікторыя» будуць выступаць маладыя майстры ручнога мяча. У мужчынскім турніры выступяць зборныя Беларусі U-19 і U-17, а таксама каманды з Расіі, Узбекістана. У жаночых спаборніцтвах на пляцоўку выйдуць каманды Беларусі, Расіі, Кыргызстана і Узбекістана.

## Стральба з лука

Цэліцца «ў яблычак» больш за дзесяць лучнікаў да 25 гадоў будзе на магілёўскім стадыёне «Спартак». Удзел у спаборніцтвах возьмуць спартсмены з усіх краін СНД і Пакістана. Найлепшыя будуць вызначыны ў індывідуальных спаборніцтвах з 70 метраў, у камандным турніры і ў спаборніцтвах змешаных пар. Турнір запланаваны з 6 да 9 жніўня.

## Каратэ

На час II Гульняў краін СНД Магілёў стане і сталіцай каратэ. Спаборніцтвы ў спартыўным комплексе «Алімпіец» збяруць сотні спартсменаў 18—24 гадоў з Беларусі, Расіі, Азербайджана, Арменіі, Узбекістана, Таджыкістана, Кыргызстана, Туркменістана і Пакістана. Барацьба разгорнецца з 12 да 13 жніўня.

## Хакей на траве

Для таго каб убачыць новы фармат хакея на траве, з 11 да 13 жніўня варта завітаць на трыбуны стадыёна «Нёман» Гродзенскага абласнога комплекснага Цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі. Новая версія хакея 5х5 абяцае яркую і дынамічную барацьбу. У жаночых спаборніцтвах яе будуць весці дзве зборныя Беларусі, каманды Расіі, Узбекістана і Казахстана. У мужчынскім турніры выступяць каманды Арменіі, Таджыкістана, Расіі, Казахстана і дзве беларускія зборныя.

## Цяжкая атлетыка

Андрэй Арамнаў, Дар'я Навумава, Яўген Ціханцоў, Пётр Асаёнак, Генадзь Лапцеў і іншыя вядомыя імёны цяжкай атлетыкі выйдуць на памост, устаноўлены ў Лядовым палацы Гродна ў рамках II Гульняў краін СНД. У горадзе над Нёманам яны разыграюць 20 камплектаў узнагарод — па дзесяць у мужчын і жанчын. Сваю сілу спартсмены будуць паказваць з 5 да 9 жніўня.

## Дзюдо

Замест ільду — татамі. Гомельскі Лядовы палац з 5 да 7 жніўня прымае спаборніцтвы дзюдаістаў. У праграме — індывідуальныя і камандныя спаборніцтвы, выступаць у якіх будуць спартсмены 2006—2008 гадоў нараджэння. Змагацца за медалі яны будуць у васьмі вагавых катэгорыях сярод юнакоў і дзяўчат.

## Самба

А ў Жлобіне свае здольнасці будуць дэманстраваць самбісты з Беларусі, Расіі, Казахстана, Арменіі, Азербайджана, Кыргызстана, Узбекістана, Таджыкістана, Туркменістана і Манголіі. У саставах камандаў — шмат пераможцаў і прызёраў чэмпіянатаў Еўропы і свету. Яны будуць спаборнічаць за медалі ў 14 вагавых катэгорыях. У выхадныя 12—13 жніўня варта завітаць у Палац гульнявых відаў спорту сталіцы металургаў.

## Барацьба

А сталіца шахцёраў падчас II Гульняў краін СНД стане сталіцай барцоў. На пляцоўцы спартыўнага комплексу «Шахцёр» у Салігорску за ўзнагароды Гульняў будуць змагаца спартсмены да 23 гадоў ва ўсіх відах барацьбы. 5 жніўня на дыван выйдуць прадстаўнікі грэка-рымскай барацьбы, 9-га — вольнай, а 13-га — жаночай. Традыцыйна з усіх буйных міжнародных стартаў беларуская барцы вяртаюцца з медалямі. Ніякіх намёкаў, толькі факты.

## Пляжны валейбол

І зусім гэта не летняя забаўка, а сур'ёзны спорт. Тым, хто сумняваецца, варта 5-6 жніўня заехаць у Маладзечна, а дакладна, у гарадскі парк культуры і адпачынку. Тут на спецыяльным стадыёне разгорнуцца баталіі па пляжным валейболе. У Маладзечне чакаюць каманды з Беларусі, Расіі, Арменіі, Казахстана.

**Валерыя СЦЯЦКО.**




### ❍ У тэму

## Прыемны бонус

Уваход на ўсе спартыўныя аб'екты вольны. Акрамя насычанай спартыўнай праграмы, для гасцей падрыхтавана шырокая турыстычная праграма. Кожны горад чакае і запрашае як мага больш людзей. Каб было зручна і цікава, любы жадаючы можа набыць картку госця II Гульняў краін СНД. Уладальнік гэтай карткі мае зніжкі ад 500 арганізацый па ўсёй краіне, сярод якіх музеі, аграсядзібы, спартыўныя базы, тэатры і іншыя.

### ❍ Даслоўна

# КЛОПАТ ДЗЯРЖАВЫ АБ РАЗВІЦЦІ СПАРТЫЎНАЙ ГАЛІНЫ ДАЕ СТАНОЎЧЫЯ ВЫНІКІ

**II Гульні краін СНД — падзея не толькі спартыўная, культурная, забаўляльная, але і палітычная, гуманітарная і сацыяльна значная. На гэта звяртаюць увагу члены Савета Рэспублікі.**

**Каліна КАПУЦКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

«За апошнія суверэнныя часы Беларусь увайшла ў дваццатку спартыўных фаварытаў свету. Адным з прыярытэтных напрамкаў сацыяльнай палітыкі ў Беларусі з'яўляецца здароўе людзей, развіццё фізічнай культуры і спорту. Асаблівая ўвага звяртаецца на ўдасканаленне фізічнага выхавання дзяцей і моладзі. Сёння ў Беларусі развіваецца звыш 130 відаў спорту. Для ўсіх гэтых відаў ёсць усе неабходныя ўмовы для правядзення трэніровак і спаборніцтваў. Заканадаўчыя акты забяспечваюць удзел дзяржавы ў развіцці і фінансаванні фізічнай культуры і спорту. Наша спартыўная інфраструктура адна з найлепшых і самых сучасных у свеце — гэта факт, яго пацвярджаюць замежныя спартсмены, якія вялі ў нашай краіне падрыхтоўку або выступалі на спаборніцтвах.

Для паспяховага развіцця спорту на тэрыторыі Беларусі праводзяцца міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы. Поспехі беларускіх спартсменаў на міжнароднай арэне сведчаць пра тое, што клопат дзяржавы аб развіцці спартыўнай галіны дае станоўчыя вынікі».

**Дзмітрый БАСКАЎ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

— II Гульні краін СНД — гэта маштабныя мультыспартыўныя спаборніцтвы, дзе нашы маладыя атлеты могуць праявіць сваё найлепшыя якасці і атрымаць унікальны спаборніцкі вопыт. Гэта яшчэ і магчымасць паказаць прыгажосць і культурнае багацце нашай краіны, пазнаёміць нашых замежных партнёраў са спартыўнымі аб'ектамі сусветнага ўзроўню.

Беларусь не першы раз прымае буйныя міжнародныя старты, але кожны раз падыходзіць да гэтага з усёй адказнасцю, імкнучыся стварыць усім удзельнікам і гасцям найбольш камфортныя ўмовы для спаборніцтваў і знаходжання ў краіне. Упэўнены, і гэтым разам II Гульні краін СНД пакажуць нам неверагодны патэнцыял новых пакаленняў беларускіх спартсменаў і падкрэсляць высокі статус нашай краіны як аднаго з найлепшых арганізатараў найбуйнейшых спартыўных падзей.

# Не губляйце галаву на пляжы

## Карэспандэнты «Звязды» разам з міліцыянерамі адправіліся ў рэйд на Цнянскае вадасховішча

**Жнівень не здае «гарачыя» пазіцыі. Гэтымі выхаднымі ўвогуле прагназуюць высокія тэмпературныя паказчыкі. А значыць, усе гарадскія і вясковыя пляжы будуць запоўненыя адпачывальнікамі. Калі ж яшчэ, як не летам, правесці час каля вады? Пакупацца ў добра прагрэтых вадаёмах, пазагараць, пасмажыць шашлыкі і паабедаць-павячэраць на свежым паветры?**



На жаль, не ўсе адпачываюць з галавой. Нецвярозых грамадзян цягне на «подзвігі». Потым, ужо ў непрытомным стане, іх дастаюць з вады ратавальнікі. Нярэдка людзі купаюцца ў не прызначаных для гэтага месцах. У такім выпадку на дапамогу ў пазаштатнай сітуацыі разлічваць на кагосьці не прыходзіцца — у выніку сумная статыстыка ахвяр вады папаўняецца новымі імёнамі. Не застрахаваныя ад трагічных выпадкаў і шматлюдныя, прызначаныя для купання месцы. Напярэдадні спякотных выхадных карэспандэнты «Звязды» далучыліся да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, якія ў летні перыяд штодзённа па ўсёй краіне патрулююць месцы масавага адпачынку.

### АЛКАГОЛЬ — ТАБУ

На адным з найбольш папулярных у мінчан вадаёмаў — Цнянскім вадасховішчы — нясуць службу байцы Атрада міліцыі асобага прызначэння. Праваахоўнікі знаходзяцца тут з 16.00 (у будныя дні) і з 9.00 (у выхадныя) да позняга вечара. Зона адказнасці — некалькі пляжаў, прылеглая лесапаркавая тэрыторыя і альтанкі, якія сталічныя жыхары займаюць з самага ранку.

— Альтанкі патрабуюць асаблівай увагі супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, — расказвае **камандзір групы 1-га ўзвода 1-й аператыўнай роты АМАПа ГУУС Мінгарвыканкама Анатоль МАРЦІНКЕВІЧ**. — Сюды прыязджаюць розныя кампаніі, некаторыя адпачываюць з раніцы да глыбокай ночы. Ёсць сярод іх і аматары алкагольных напояў. Не ўсе адэкватна рэагуюць на заўвагі міліцыянераў не ўжываць спіртное ў грамадскім месцы. У цэлым, людзі сталі больш дысцыплінаваныя: паводзяць сябе культурна, не парушаюць грамадскі парадак.

У любым выпадку, заўважаюць супрацоўнікі міліцыі на сталах алкагольныя напоі ці не, яны падыходзяць да кожнай кампаніі і праводзяць прафілактычную размову.

— Добры дзень! — звяртаецца да двух маладых людзей, якія наразаюць гародніну, супрацоўнік АМАПа.

— Вітаем вас!

— Як настрой? — цікавіцца вартавы парадку і адразу дае слушную параду: — Папрашу вас не ўжываць алкагольныя напоі. Падобныя дзеянні ў грамадскім месцы пагражаюць адміністрацыйнай адказнасцю.

— Мы ўвогуле не п'ём, вядзём здаровы спосаб жыцця, — кажа адзін з адпачывальнікаў, якога завуць Андрэй. — У нас карпаратыў. Зараз пад'едуць калегі. Спіртнога ў нас няма і не будзе.

— Аб адказнасці мы вас папярэдзілі. Добрага вечара! — развітваюцца з хлопцамі міліцыянеры.

Ужо для журналістаў Андрэй, які размаўляў з супрацоўнікамі міліцыі, адзначае, што неабходна кантраляваць месцы масавага адпачынку грамадзян. «Дэбашыраў хапае», — заўважае ён і ўдакладняе, што побач з людзьмі ў пагонах адчувае сябе больш спакойна.

У іншай альтанцы, да якой падышлі супрацоўнікі АМАПа, адпачывала большая кампанія. Некалькі бляшанак піва на стале адразу кінулася ў вочы.

— Добры дзень! — пачынае гаворку міліцыянер. — Ужыванне ў грамадскіх месцах алкагольных і слабаалкагольных напояў не прадугледжана Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях. Папрашу вас не парушаць заканадаўства.



— Зразумелі. Падобнае не паўторыцца, — запэўнівае адзін з адпачывальнікаў.

Людзі адэкватна рэагуюць на заўвагі і просьбы супрацоўнікаў міліцыі. Аднак так бывае не заўсёды. Той, хто не звяртае ўвагі на рэкамендацыі людзей у форме або ўвогуле ўступае з імі ў канфлікт, адпраўляецца ў гарадскі аддзел міліцыі, дзе на нядобрасумленнага грамадзяніна складаецца адміністрацыйны пратакол. Асабліва буйных чакае арышт.

### ДЗЕЦІ — У ПОЛІ ЗРОКУ БАЦЬКОЎ

Рэгулярна супрацоўнікі міліцыі праходзяць і каля вады. Асаблівую ўвагу звяртаюць на дзяцей, якія знаходзяцца без догляду дарослых. У такім выпадку ўстанаўліваецца адрас дзіцяці, міліцыянеры звязваюцца з бацькамі — у выніку сям'ю чакае сустрэча з супрацоўнікам інспекцыі па справах непаўналетніх. «На шчасце, сітуацыі, калі дзеці знаходзяцца каля вады адны, рэдкія, — заўважае Анатоль Марцінкевіч. — Радуе, што ў большасці дарослыя разумеюць сваю адказнасць і адпачываюць каля вады побач са сваімі дзецьмі».

Трапляюць у поле зроку супрацоўнікаў міліцыі і нецвярозыя грамадзяне, калі збіраюцца плаваць. Такіх адразу адпраўляюць дахаты. Калі не пагаджаюцца — у гарадскі аддзел міліцыі.

— Радуе, што апошнім часам нам не даводзілася кагосьці ратаваць з вады, — адзначае камандзір групы. — Аднак падчас інструктажу, якія кожны дзень праводзяцца з супрацоўнікамі, што заступаюць на службу, прагаворваецца алгарытм дзеянняў па выратаванні таго, хто тоне. Міліцыянеры ведаюць, як дзейнічаць у экстраннай сітуацыі, пры неабходнасці акажуць першую медыцынскую дапамогу.

Каля вады і ў вадзе ўсё спакойна. Людзі купаюцца, загараюць, дзеці — пад кантролем дарослых. Адна нядобрасумленная кампанія прыцягнула ўвагу супрацоўнікаў міліцыі. Дзяўчаты пілі піва. Убачыўшы міліцыянераў, яны замітусіліся, пачалі хаваць бутэлькі. У гутарцы з праваахоўнікамі пагадзіліся, што парушылі заканадаўства, і запэўнілі, што падобнае больш не паўторыцца.

Ужо ў размове з журналістамі супрацоўнік АМАПа растлумачыў, што ў іх няма мэты сапсаваць камусьці адпачынак, а тым больш кагосьці затрымліваць. «У нашых інтарэсах папярэдзіць тое ці іншае правапарушэнне, каб не дапусціць непапраўнага», — дадаў ён.

### НЕ ПАКІДАЦЬ, КАБ НЕ СТРАЦІЦЬ

Падчас патрулявання пляжнай зоны супрацоўнікі АМАПа ўпэўніліся, што ўсе асабістыя рэчы адпачывальнікаў знаходзяцца пад наглядам. Бывае, што на коўдры ляжаць дарагі тэлефон, гадзіннік, ключы, а гаспадар рэчаў купаецца. У такім выпадку міліцыянеры чакаюць, пакуль чалавек вернецца, і тлумачаць яму, што лепш не пакідаць рэчы без нагляду. Здаецца, усюды людзі, нават устаноўлены відэакамеры, але ўсё роўна знаходзяцца грамадзяне, ласыя на чужое. Устанавіць асобу злачынцы для органаў унутраных спраў не стварае складанасці. Як паведамілі супрацоўнікі міліцыі, усе факты крадзяжу, якія былі зафіксаваны падчас сёлетняга купальнага сезона, раскрытыя, распачатыя крымінальныя справы — грамадзяне будуць прыцягнутыя да ўстаноўленай заканадаўствам адказнасці.

Перш за ўсё сістэмы відэаназірання накіраваны на прафілактыку правапарушэнняў. Выкарыстоўваюцца яны яшчэ і з той мэтай, каб у рэальным часе назіраць за абстаноўкай. Напрыклад, дзяжурная група патрулюе адзін пляж Цнянскага вадасховішча і не бачыць, што на іншым, дапусцім, адбываецца бойка. У такім выпадку гарадскі аддзел міліцыі, куды сігнал трапляе з відэакамер, інфармуе калег, што дзяжураць на вадасховішчы, і тыя апаратыўна выбываюць да месца здарэння. Калі ім патрэбная дапамога, прыязджае дадатковы нарад.

Пакуль мы з міліцыянерамі ішлі на аўтастаянку, каб пракантраляваць, ці зачыненыя ў аўтамабілях наведвальнікаў вокны, побач спыніўся малады чалавек. Ён спытаў, дзе можна прывязаць веласіпед, каб яго не ўкралі. Супрацоўнікі паказалі, дзе гэта будзе небяспечна. Падзякаваўшы, малады чалавек пайшоў па ўказаным маршруце.

На паркоўцы ўсе аўтамабілі былі з зачыненымі вокнамі. Навошта тое кантраляваць міліцыянерам? Усё з той жа прычыны — каб папярэдзіць крадзяжы. Адчыненыя вокны — гэта як лакмусавая паперка для нядобрасумленных грамадзян. Таму як толькі праваахоўнікі бачаць такі аўтамабіль, тэлефануюць (на шчасце, амаль усе аўтауладальнікі пакідаюць запіску са сваім нумарам) гаспадарам аўто і просяць зачыніць вокны.

### ЛЕПШ ПАПЯРЭДЗІЦЬ, ЧЫМ ПОТЫМ РАТАВАЦЬ

Міліцыянеры цесна ўзаемадзейнічаюць з прадстаўнікамі Таварыства выратавання на водах, якія пастаянна нясуць дзяжурства на Цнянскім вадасховішчы. Заступаючы ў нарад, людзі ў пагонах абменьваюцца з ратавальнікамі тэлефонамі, каб у выпадку неабходнасці звярнуцца да іх па дапамогу.

Рэгулярна разам з супрацоўнікамі Таварыства выратавання на водах міліцыянеры на маторнай лодцы даследуюць водную паверхню: аб'язджаюць нават не прызначаныя для купання месцы. Аказваецца, людзей, якія гатовыя рызыкаваць уласным жыццём і купацца там, дзе небяспечна, хапае. Дастаткова пад'ехаць да іх і папярэдзіць, чым можа скончыцца такое купанне. З тымі, хто не рэагуе на заўвагі (зноў жа нецвярозыя), даводзіцца дзейнічаць іншымі метадамі.

— Супрацоўнікі міліцыі нам дапамагаюць, — адзначае **дзяжурны па выратавальнай станцыі «Цнянская» Сяргей АМБРАЖЭЙ**. — На пляжы дзяжураць пешыя нарады, ёсць аўтапатруль. Асноўную ўвагу звяртаем на дзяцей, якія знаходзяцца каля вады без нагляду дарослых, і людзей у алкагольным ап'яненні. Імкнёмся выправіць сітуацыю мірна, ціха — нецвярозых адпраўляем дахаты. Калі яны пачынаюць «качаць» свае правы, нецэнзурна выказвацца, адзін званок супрацоўніку міліцыі — і ў лічаныя хвіліны, а то і раней, з'яўляюцца людзі ў пагонах і вязуць парушальнікаў парадку на афармленне пратакола.

Як расказвае Сяргей Канстанцінавіч, у бягучы купальны сезон асабіста ён тройчы выязджаў па трывозе. Адзін раз выцягваў з вады жанчыну ў алкагольным ап'яненні. Другі раз быў ілжывы сігнал. Трэці аказалі дапамогу мужчыну, які, адплыўшы ад берага, адчуў сябе дрэнна. На шчасце, пацярпелых не было.

Па словах ратавальніка, у больш як 80 % выпадкаў на вадзе гінуць людзі, якія знаходзяцца ў нецвярозым стане. «Як і супрацоўнікі органаў унутраных спраў, мы пастаянна займаемся прафілактычнай работай, — адзначае дзяжурны па выратавальнай станцыі «Цнянская». — Вадалазы людзям кажуць: лепш мы вас папярэдзім, дзесьці нават жорстка, чым потым будзем спускацца на дно. Некаторыя ўжо хадзіць не могуць, а ў ваду лезуць. Гэта патэнцыяльныя трупы. Калі дарослыя прыходзяць на пляж з дзецьмі, яны павінны за імі глядзець. Нярэдка мы бяром мегафон і звяртаемся да жанчын: «Мамы, перавярніцеся, калі ласка, на спіну: ніякі загар не можа быць важнейшы, чым жыццё вашага дзіцяці».

— У цэлым па краіне назіраецца зніжэнне колькасці патанулых пры купанні: у параўнанні з мінулым годам — практычна ў два разы, — рэзюмуе **намеснік начальніка ўпраўлення галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнік міліцыі Кірыл ПАШКЕВІЧ**. — У першую чаргу, гэта звязана з актыўнай прафілактычнай работай як органаў унутраных спраў, так і іншых зацікаўленых ведамстваў. Сёлета па ініцыятыве міліцыі практычна ва ўсіх месцах, не абсталяваных для купання, устаноўлены спецыяльныя таблічкі аб забароне. Там, дзе гэта было магчыма, створаны тэхнічныя абмежаванні доступу да такіх месцаў — усё для таго, каб спыніць жаданне людзей купацца там, дзе небяспечна. Найбольш папулярныя месцы масавага адпачынку абсталяваны сістэмамі відэаназірання. З бягучага года для выяўлення правапарушэнняў актыўна выкарыстоўваюцца беспілотныя лятальныя апараты. Дзякуючы тэхнічным сродкам супрацоўнікамі органаў унутраных спраў з лёгкасцю выяўляюцца любыя правапарушэнні.

Аднак грамадзяне, якія адпраўляюцца да вадаёмаў, павінны памятаць галоўнае — ні міліцыянераў, ні ратавальнікаў падчас надзвычайнай сітуацыі побач можа не быць. Часам для трагедыі дастаткова некалькі секундаў. Таму памятайце аб правілах бяспекі, не парушайце ўстаноўлены заканадаўствам парадак — і тады аб вашым адпачынку застануцца толькі самыя добрыя ўспаміны.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Центр Промышленной Оценки

- ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
- ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16. УНП 100868495 |

**Предмет аукциона** (одним лотом)
**Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

Производственная база в составе: **производ. корпуса** (1130,5 кв. м, 500/С-49698; 4340,5 кв. м, 500/С-53224), **диспетчерская** (54,7 кв. м, 500/С-53818), **здание специализир. иного назначения (литейный цех)** (7664,8 кв. м, 500/С-47329), **компрессорная** (473,6 кв. м, 500/С-54017), **электропечь термическая** (39,8 кв. м, 500/С-54018), **здание весовой** (24,3 кв. м, 500/С-54019), **административно-хоз. корпус** (2323,4 кв. м, 500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. Путь, дорожки, подпор. Стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница), **склад** (2328,4 кв. м, 500/С-53297), **склады** (895,5 кв. м, 500/С-53808), **склады, гаражи** (453,6 кв. м, 500/С-53897), **склады, администрат. помещения, агрегатные** (563,7 кв. м, 500/С-53846), **инженерный корпус** (3348,6 кв. м, 500/С-46093), **административно-производ. корпус № 4** (19710,5 кв. м, 500/С-53638), **склад** (2193,5 кв. м, 500/D-708019487), **строительный цех** (507,9 кв. м, 500/С-53845), **насосная станция автоматич. пожаротушения** (194,4 кв. м, 500/С-54016), **станция очистки сточных вод** (305,1 кв. м, 500/С-54015), **градирня** (39,1 кв. м, 500/С-55130), **ливневая канализац. сеть** (1077,5 м, 500/С-1029279), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (973,2 м, 500/С-1029266), **тепловая сеть** (236,7 м, 500/С-1029272).
**Иное имущество, входящее в состав лота:** газопровод внутрицеховой (инв. № 12050078), внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), внутриплощадочные кабельные сети (инв. № 12020085), токопровод из алюминиевых шин 3–4 корп. (инв. № 12080111), площадка для складирования песка (гравий, инв. № 11010193), склад баллонов с кислородом (инв. № 10020854), склад для хранения баллонов с аммиаком (инв. № 10020280), склад металлический (инструмент) (инв. № 10020810), склад макулатуры (инв. № 10020877), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. № 13041182, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. № 13040099, 13040120), комплекты ТП (инв. № 13040082, 13040053, 13040030), комплект. распред устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты груз. (инв. № 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности: береза бородавчатая (инв. № 20054010), вишня, 4 шт. (инв. № 20054002), груша (инв. № 20010005), яблоня (инв. № 20054008), липа мелколистная, 3 шт. (инв. № 20054005), газоны, 10 шт. (инв. № 20050404)

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.08.2029).
***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га)

**Обременения по лоту:** площади зданий частично сданы в аренду. Здание с инвентар. Номерами 500/С-53224 находятся в залоге у банка. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
На территории лота расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота.
Покупатель одновременно с подписанием договора купли-продажи недвижимости заключает с Продавцом предварительный договор аренды на часть капитального строения, инв. № 500/С-49698 (комната № 4 (подстанция) 33,6 кв. м, и комната № 5 (подстанция) 52,0 кв. м). Договор аренды Покупатель обязуется заключить с Продавцом в течение 2-х рабочих дней с момента перехода права собственности на объект недвижимости. С предварительным договором о заключении договора аренды части капитального строения можно ознакомиться на сайте организатора аукциона: www.cpo.by.
В соответствии с градостроит. проектом детального планирования, на зем. участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекат., выставочно-музейно-просветит. назначения

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 21 091 497,80 бел. руб.** (снижена на 30 %)

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30 (тридцать) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,15 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: www.cpo.by

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.06.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **22.08.2022** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **21.08.2022** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

УНП 100097978

ООО «ИПМ-Консалт оценка» информирует, что **начальная цена имущества ЧУП «Фаэтон-МАЗ» (в количестве 5 лотов) указана без НДС** (публикация извещения в газете «Звязда» от 21.07.2023 г.).
Тел.: +375 17-280-36-37, +375 29-317-95-42, www. ipmtorgi.by

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Застройщик – государственное предприятие
«УКС Фрунзенского района г. Минска»,
зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 за № 190580553

*Место нахождения: 220074, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А*
*тел.: (8017) 399 53 94; (8017) 370 84 18, (8044) 785 84 81, (8029) 323 11 11*
*Режим работы – приемное время: понедельник–четверг с 8.45 до 18.00; обеденный перерыв с 13.00 до 14.00; выходные дни: суббота, воскресенье*

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:
1) Жилой дом № 14 по ул. Маршала Лосика;
2) Жилой дом № 16 по ул. Маршала Лосика.
3) Жилой дом № 21 по ул. Юрия Семеняко;
4) Жилой дом № 23 по ул. Юрия Семеняко;
5) Жилой дом № 27 по ул. Юрия Семеняко;
6) Жилой дом № 29 по ул. Юрия Семеняко;
7) Жилой дом № 1А по ул. Максима Горецкого.
Также предприятием осуществляется строительство объектов социального назначения.

Застройщиком получены:
- свидетельство (удостоверение) № 500/526-15816 о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000006010986;
- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный председателем Минского городского исполнительного комитета 04.03.2022;
- заключения государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» от 31.03.2023 № 104-15/23, от 17.05.2023 № 301-15/23; от 25.07.2023 № 620-15/23;
- решение Мингорисполкома от 13.04.2023 № 1357 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
- извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 05.06.2023 № 2-208И-021/23;
- договор строительного подряда от 31.07.2023 № 20-07/2023 с ОАО «МАПИД».

Информация о проекте.
Проектом предусмотрено строительство объекта «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 2». 2 очередь строительства. Жилой дом № 20 по генплану.
Жилой дом № 20 по генплану запроектирован на основе проектных решений жилых домов типовой серии М 464М-16, состоит их 4-х секций в 16 этажей на 256 квартир.
Дом запроектирован с техподпольем и техническим чердаком. На первом этаже запроектированы комната уборочного инвентаря, колясочные, лестнично-лифтовые блоки с лифтами грузоподъемностью 1000–630 кг и 400 кг.
Внутренняя отделка:
стены – оклейка обоями с окраской, покраска водостойкими красками;
потолки – окраска акриловой краской;
полы – линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове, керамическая плитка;
окна – профиль ПВХ, оснащены детскими замками безопасности;
двери – металлические, деревянные.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства 256 квартир для граждан, в первую очередь многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, по направлениям соответствующих администраций районов:
- 4 однокомнатные квартиры;
- 124 двухкомнатные квартиры;
- 128 трехкомнатных квартир.

Цена 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства в жилом доме № 20 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет – 2 278,72 бел. рублей.

Начало строительства – 01 августа 2023 года.
Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – 30 ноября 2024 года.

Для заключения договора необходимо:
- личное присутствие и паспорт (идентификационная карта) того лица, с кем будет заключаться договор;
- направление администрации района г. Минска;
- быть готовым оплатить в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента получения договора 10 процентов от общей стоимости объекта долевого строительства.

**ООО «Индустрия Инноваций»**
сообщает об изменении даты проведения публичных электронных торгов (аукционов), извещение о проведении которых опубликовано в выпуске № 110 (29990) от 10.06.2023 (стр. 15).
Подробности на сайте: **https://iintorgi.by.**
УНП 291 442411

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**ИНФОРМИРУЕТ о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Бакалея Гродно»**

**Аукцион состоится 06.09.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона Начальная цена продажи, сумма задатка** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-97271 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 137,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 42.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422084506801000509, площадью 0,1090 га (назначение – для размещения здания магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 42. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта – код 2.4, площадью 0,1090 га; земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код – 2.4, площадью 0,1090 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2., площадью 0,0010 га.<br>Обременения со стороны 3-х лиц:<br>- в виде аренды капитального строения, инв. № 400/С-97271 сроком по 31.07.2025 г.;<br>- от здания специализированного розничной торговли с инвентарным номером 400/С-97271, расположенное по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 42, подключено отопление и элекроснабжение к зданию специализированной розничной торговли с инвентарным номером 400/С-95222, расположенное по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40А.<br>Начальная цена продажи лота – 746 785,52 р. (семьсот сорок шесть тысяч семьсот восемьдесят пять рублей пятьдесят две копейки) с учетом НДС.<br>Сумма задатка – 74 678 р. (семьдесят четыре тысячи шестьсот семьдесят восемь рублей) |
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона Начальная цена продажи, сумма задатка** | ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 400/С-95222 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 79,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40А.<br>Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422084506801000096, площадью 0,0841 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для эксплуатации и обслуживания магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40А. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0013 га; земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,0841 га; земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код – 2.4, площадью 0,0841 га.<br>Обременения со стороны 3-х лиц: отопление и электроснабжение здания специализированного розничной торговли с инвентарным номером 400/С-95222, расположенное по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40А, подключено от здания специализированного розничной торговли с инвентарным номером 400/С-97271, расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 42.<br>Начальная цена продажи лота – 443 177,77 руб. (четыреста сорок три тысячи сто семьдесят семь рублей семьдесят семь копеек) с учетом НДС.<br>Сумма задатка – 44 317 руб. (сорок четыре тысячи триста семнадцать рублей) |

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 0,8 % от конечной цены продажи объекта

| | |
|---|---|
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 04.09.2023 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Предметы торгов | Начальная цена (с учетом НДС), руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот: погрузчик экскаватор цепной ДЗ-133 ЭЦ, год выпуска – 2004, регистрационный знак АК-1 8508** | 14 400,00 | 1 440,00 |

**Продавец:** ОАО «Стройгаз, г. Брест», г. Брест, ул. Я. Купалы, 108К, тел./ф. 80162340466. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 80162 40 87 01. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк», ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** предоплата 100 % в течение 5 (пяти) дней с даты заключения договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 05 сентября 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, их также можно узнать по телефонам: 80162 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 04 сентября 2023 г. до 17.00**

# «ХАЧУ БЕЗ БОЯЗІ САРВАЦЬ ПУЧОК ЗЯЛЕНІВА...»

## Аднак сусед апрацаваў хіміяй сваю пшаніцу

**«За зямельнымі ўчасткамі па нашай вуліцы, — піша Сяргей Сямёнаў з вёскі Вялікая Ліпа Нясвіжскага раёна, — утварылася пустырка (хтосьці памёр, хтосьці з'ехаў). Летась сельсавет аддаў яе маім суседзям у арэнду. Сёлета сусед пасеяў там пшаніцу і апрацоўвае яе хімікатамі з дапамогай трактара з апырсквальнікам у парушэнне заканадаўства...»**



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

***— Участак вашы суседзі атрымалі ў арэнду больш як год таму, але вы звярнуліся толькі цяпер. Чаму? — пераадрасавала Сяргею Сямёнаву пытанне, якое не раз чула ад прадстаўнікоў мясцовай улады.***

— Сапраўды, свае пасевы сусед апырскваў хіміяй не ўпершыню. Летась у яго тут быў авёс, сёлета — пшаніца. Я раней не абураўся, бо калі ён апрацоўваў, кірунак ветру быў паўночны — іншымі словамі, ад майго ўчастка. А сёлета ён крыху не разлічыў... Гэта здарылася 2 мая, вецер быў паўднёвы, я праз старасць заспаў. Прачынаюся, выходжу на двор — дыхаць немагчыма. Званю па «гарачай лініі» ў раённую газету — ігнор. Праз некалькі дзён звярнуўся на «гарачую лінію» ў райвыканкам, потым напісаў пісьмо ў сельсавет. Адказы прыйшлі, ды толькі яны мяне не задавальняюць. У прыватнасці, у апошнім напісалі, што арандатарам «у цэлым выконваюцца нарматыўныя прававыя акты ў галіне аховы раслін».

Прыязджала камісія з раёна, штосьці казалі пра 50 метраў, якія як быццам вытрымліваюцца ад майго дома. А пры чым тут дом? У п. 50 санітарных нормаў і правілаў чорным па белым напісана «не менш за 50 метраў ад месцаў правядзення ручных работ», — то-бок ад майго плота, за якім я і вяду ручныя работы. ...Прасілі, каб я даў магчымасць суседу спакойна ўбраць пшаніцу, не знішчаць жа цяпер пасевы. Ды я і не патрабаваў нічога знішчаць. Я наогул не супраць, няхай ён на здароўе садзіць там пшаніцу ці штосьці іншае і налета. Але раз узяў зямлю побач з домам, то павінен займацца экалагічным земляробствам. Не парушаць санітарныя правілы (бо яны ж напісаныя разумнымі людзьмі не проста так, магчыма, нечымі жыццямі), не атручваць суседзяў. Я так разумею, той жа сельсавет, калі выдзяляў ім участак, павінен быў папярэдзіць, што вось існуюць такія санітарныя правілы і ты павінен іх выконваць. Бо я хачу (і маю поўнае права, як і іншыя вяскоўцы) раніцай выйсці і спакойна сарваць пучок зяленіва, ягадку, не баючыся, што яны невядома чым апрацаваныя.

### 50 метраў ад агароджы ці ад дома?

Па каментарый я звярнулася ў ДУ «Нясвіжскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі». **Галоўны санітарны ўрач Ірына ШЫМАНСКАЯ** распавяла, што спецыялісты санэпідэмстанцыі па просьбе райвыканкама выязджалі на месца, каб разабрацца ў сітуацыі. Высветлілі, што Ліпскі сельвыканкам сапраўды выдзеліў жыхарцы Вялікай Ліпы ў часовае карыстанне на 9 гадоў два зямельныя ўчасткі агульнай плошчай 2,40 га пад агародніцтва. Яны знаходзяцца на адлегласці 10—15 метраў ад домаўладання Сяргея Сямёнава. Акрамя таго, устанавілі, што муж арандатаркі сапраўды ўносіў прэпарат «Лінтур» 3-га класа небяспекі і мінеральныя ўгнаенні пры дапамозе трактара з апырсквальнікам. Усе гэтыя сродкі законныя і дазволеныя. Але ж... Нарматыўнымі дакументамі (тут і далей маюцца на ўвазе патрабаванні санітарных нормаў і правілаў, зацверджаныя пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 27.09.2012 № 149, да прымянення пестыцыдаў (сродкаў аховы раслін), аграхімікатаў і мінеральных угнаенняў у межах населеных пунктаў) выкарыстанне тэхнікі для апырсквання пасеваў у дадзенай сітуацыі не прадугледжана. Паколькі жанчына атрымала зямлю ў арэнду для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, то павінна кіравацца патрабаваннямі, прапісанымі ў главе 14 («Прымяненне пестыцыдаў і аграхімікатаў ва ўмовах уласных падсобных гаспадарак»). Там у п. 152 напісана, што «для ўнясення раствораў пестыцыдаў і аграхімікатаў могуць прымяняцца толькі апырсквальнікі ранцавага тыпу».

«Адсюль вынікае, што ў асабістых падсобных гаспадарках дазваляецца толькі ручное апырскванне, а значыць забароненае прымяненне для гэтых мэт тэхнікі, у тым ліку трактара. Мы арандатару растлумачылі гэта і папярэдзілі, у тым ліку ў пісьмовай форме, што пры паўторным парушэнні будзем вымушаныя прыцягнуць яе да адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне патрабаванняў главы 14. Бо як жа запускаць трактар, калі жылыя дамы стаяць зусім блізка, а там жа могуць быць і калодзежы, і дамашнія жывёлы... Я дапускаю, што чалавек першы раз мог чагосьці не ведаць. Але калі атрымліваем скаргі аб паўторным парушэнні, у першую чаргу ўзнікае заканамернае пытанне — як наогул выконваецца правіла добрасуседства? Побач з вамі знаходзяцца людзі, а вы ім шкодзіце, атрымліваецца, вам проста пляваць на суседзяў?»

***— Я размаўляла з арандатаркай, яна казала пра тое, што апрацаваць 2,4 га зямлі ўручную, калі б і хацела, нерэальна...***

— Тут ёсць рашэнне, і мы таксама ёй яго агучвалі. Калі яны хочуць апрацоўваць пасевы трактарам, як тое робіцца ў вялікіх сельскагаспадарчых арганізацыях, значыць, будзьце ласкавыя, выконвайце нарміраваную адлегласць для прамысловай апрацоўкі — яна складае не менш за 50 метраў. Іншымі словамі: адступаеце 50 метраў ад жылой забудовы і апрацоўваеце пшаніцу, якая трапіла ў санітарна-ахоўную зону (умоўна кажучы, калі ад агароджы да пшанічнага поля 15 метраў, то там яшчэ трэба адступіць 35 метраў), уручную (ранцавымі апырсквальнікамі або можна проста павыдзіраць пустазелле рукамі), а ўсё, што далей, калі ласка — можна і трактарам: мы не супраць.

***— Ірына Георгіеўна, хачу ўсё ж такі ўдакладніць — адступаць трэба 50 метраў ад граніцы суседскага ўчастка ці ад яго дома? Бо ў размове з Сяргеем Сямёнавым і прадстаўнікамі мясцовай улады шмат разоў гучала гэтая лічба. Толькі адны спасылаюцца на главу 4 (п. 50) санітарных правілаў, дзе ахоўная зона складае 50 метраў ад агароджы, іншыя — на главу 11 (п. 125), дзе 50 метраў лічацца ад жылога дома.***

— Ад граніцы ўчастка домаўладання. Калі ўчастак агароджаны плотам, значыць, ад агароджы тэрыторыі жылой забудовы. Тут мы кіруемся главой 4 (п. 50), дзе гаворка ідзе пра ўнясенне сродкаў аховы раслін у прамысловых маштабах пры дапамозе трактара. У прыватнасці, «пры наземным апырскванні пестыцыдамі, аграхімікатамі і мінеральнымі ўгнаеннямі санітарныя разрывы ад населеных пунктаў, крыніц пітнога і санітарна-бытавога водакарыстання, месцаў адпачынку насельніцтва і месцаў правядзення ручных работ па доглядзе за сельскагаспадарчымі культурамі павінны складаць не менш за 50 метраў». Тэрыторыя домаўладання — гэта і ёсць месцы адпачынку насельніцтва. Людзі ж не павінны зачыняцца ў доме і сядзець там, чакаючы, пакуль дзесьці завершыцца апрацоўка.

У главе 11 (п. 125) значыцца, што «апрацоўка праводзіцца пры ўмове выканання санітарных разрываў да жылых дамоў не менш за 50 метраў». Тут гаворка ідзе не пра сельскагаспадарчыя палі: маецца на ўвазе апрацоўка ад шкоднікаў зялёных насаджэнняў у парках, скверах, зонах адпачынку, што месцяцца ў населеных пунктах.

### «А далей будзем глядзець»

Што датычыцца ўмоў надвор'я і часу, у які праводзілася апрацоўка пшаніцы ў Вялікай Ліпе, цяпер складана штосьці даказаць. Арандатар сцвярджае, што заўсёды апырсквалі ў бязветранае надвор'е і пасля 22.00. Маўляў, які сэнс уносіць пестыцыды ды ўгнаенне падчас моцнага ветру, «яно ж усё разнясецца ў паветры, мы ж не ворагі самі сабе працаваць на шкоду». Тым не менш, санэпідэмстацыя і райвыканкам на ўсякі выпадак у пісьмовай форме ўказалі на няўхільнае выкананне наступных патрабаванняў. Па-першае, «работа з пестыцыдамі і аграхімікатамі павінна праводзіцца ў раннія ранішнія (да 10 гадзін) і вячэрнія (пасля 18 гадзін) гадзіны, у бязветранае надвор'е». Па-другое, працягласць апрацоўкі «не павінна перавышаць 1 гадзіны». (Глава 14 п. 150). У выпадку ж выкарыстання вентылятарных і шлангавых трактарных апырсквальнікаў пры выкананні санітарнага разрыву не менш за 50 метраў апрацоўка павінна рабіцца пры спрыяльных метэаралагічных умовах «хуткасці ветру не больш за 4 м/с, адноснай вільготнасці паветра не менш за 40 % і не больш за 80 % і пры тэмпературы паветра, указанай у рэкамендацыях па прымяненні канкрэтных пестыцыдаў, аграхімікатаў і мінеральных угнаенняў» (Глава 4 п. 48).

«Там, на месцы пшанічнага поля, раней былі страшныя заraснікі, бур'ян. Людзі навялі парадак, пасеялі пшаніцу, яна ў іх чысценькая, дагледжаная, — адзначыла **кіраўнік спраў Нясвіжскага райвыканкама Таццяна ШУМОЎСКАЯ**, якая адказвае за работу са зваротамі грамадзян. — Калі мы выязджалі з камісіяй на месца, я па-чалавечы папрасіла Сяргея Сямёнава даць суседзям спакойна ўбраць ураджай, бо яны ж уклалі туды шмат грошай і працы. А далей будзем глядзець. Калі завершыцца ўборачная, зноў выедзем на месца і падумаем, што рабіць, каб сітуацыю неяк згладзіць, каб больш не ўзнікала канфліктаў паміж суседзямі. Магчыма, прапануем арандатарам кавалак зямлі дзе-небудзь у іншым месцы. Альбо зменшым участак на некалькі метраў, каб выканаць неабходны разрыў у 50 метраў. Бо калі мераць ад агароджы, а не ад дома, то там сапраўды ёсць парушэнне. Пакуль жа дамовіліся, што арандатар у далейшым будзе загадзя папярэджваць людзей, якія жывуць паблізу ўчастка, што апрацоўваецца, аб даце і часе правядзення работ».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

### Падобныя звароты — не адзінкавыя

Паводле слоў галоўнага санітарнага ўрача Нясвіжскага раёна, зварот Сяргея Сямёнава не адзінкавы. «Амаль штогод да нас паступаюць падобныя сігналы ад насельніцтва, калі яны пацвярджаюцца, парушальнікі прыцягваюцца да адказнасці, — кажа Ірына Шыманская. — Былі сітуацыі, калі людзі апрацоўвалі бульбу ад каларадскага жука ранцавым апырсквальнікам, і суседзі паскардзіліся, што ў іх пажаўцела трава каля плота. Мы выязджалі, тлумачылі, каб яны не пырскалі проста каля агароджы. Часта звяртаюцца людзі, якія жывуць побач з калгаснымі палямі. Мы штрафавалі агранома, пісалі пісьмо ў праўленне сельскагаспадарчай арганізацыі, каб пераглядзелі палі севазвароту. Старшынь гаспадарак можна зразумець, бо заканадаўства патрабуе, каб зямля не пуставала, кожны свабодны метр павінен уцягвацца ў севазварот. У якасці кампрамісу мы прапаноўваем побач з прыватнымі домаўладаннямі сеяць траву, якая не апрацоўваецца і якая потым косіцца на корм жывёле. Альбо арганізоўваць ручную праполку сельскагаспадарчых культур у месцах, якія прымыкаюць да жылых двароў. Гэта невялікія плошчы, домаўладанне ж не цягнецца кіламетры. І некаторыя калгасы ідуць насустрач, у прыватнасці, жанчыны-паляводы ў Студзёнках праполвалі кукурузу ўручную ў санітарна-ахоўнай зоне. Мы не толькі аператыўна стараемся рэагаваць на сігналы насельніцтва аб парушэннях заканадаўства, звязаных з апрацоўкай палёў пестыцыдамі, але і штогод абавязкова праводзім вучобу з аграномамі, дзе агучваем усе праблемныя пытанні.

### Ад аўтара

Калі рыхтавала гэты матэрыял, чарговы раз думала пра тое, што... Каб кожны чалавек, перш чым нешта зрабіць, ставіў сябе на месца іншага, то было б значна больш шчаслівых людзей і дружных суседзяў. А значыць, сэканомленых нерваў і часу на разбор. А таксама пра тое, як важна ўмець прызнаваць свае памылкі. І як часам няпроста адстаяць свае правы, даказаць, што правы. І яшчэ — цудоўна, што ёсць прынцыповыя людзі, якія не могуць маўчаць, калі бачаць парушэнне ці несправядлівасць. І што выбіраюць менавіта «родную газету на роднай мове», каб дапамагала адстаяць сваё права, у даным выпадку — на чыстае паветра ды экалагічную гародніну і садавіну...

Шаноўныя чытачы, калі і ў вас ёсць пытанні, якія хвалююць, пішыце! Паспрабуем разабрацца ў праблемнай сітуацыі разам. Наш паштовы адрас: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013; электронны адрас для зваротаў — zvarot@zviazda.by.

Ігар ЛУЧАНОК:

Постаці

# «МАЯ ПАЛІТЫКА — ГЭТА МАЕ ПЕСНІ»

**Заўтра выдатнаму беларускаму кампазітару Ігару Лучанку споўнілася б 85 гадоў, а ўжо амаль пяць гадоў як яго няма з намі. Але жывуць яго песні, жыве народная памяць аб ім. Светлым сонечным промнем Ігар Міхайлавіч застаўся і ў маёй памяці.**
**Гаварыць з Лучанком было няпроста. Але дужа цікава.**
**Ён — меладыст ад Бога. Нават калі б ён стварыў толькі адну песню «Мой родны кут» на словы Якуба Коласа, то і пры гэтым імя Лучанка засталося б навечна ў нацыянальнай культуры.**
**Да кампазітара Ігара Лучанка слава, прызнанне прыйшлі даволі рана. Яму было ўсяго дваццаць восем, калі яго «Памяць сэрца» атрымала першую прэмію на Усесаюзным конкурсе савецкай песні. Сам старшыня журы, легендарны Леанід Уцёсаў, падышоў пасля да маладога кампазітара і, моцна пацiснуўшы руку, выказаў цёплыя словы ўдзячнасці.**
**У дваццаць дзевяць Лучанку была прысуджана камсамольская прэмія Беларусі, у трыццаць чатыры — прэмія Ленінскага камсамола, у трыццаць восем — Дзяржаўная прэмія БССР.**
**Ён узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Дружбы народаў, Францыска Скарыны, шматлікімі медалямі.**
**Усе самыя высокія званні Лучанок атрымаў, калі яму не было яшчэ і пяцідзесяці. Заслужаны дзеяч мастацтваў — у трыццаць пяць, народны артыст БССР — у сорак чатыры, народны артыст СССР — у сорак дзевяць. І абсалютна дакладна: Ігар Лучанок — першы беларус, які стаў уладальнікам імяннай зоркі на плошчы Зорак эстрады ў Маскве.**



## МОЙ РОДНЫ КУТ

***— Ігар Міхайлавіч, музычныя здольнасці вы атрымалі ў спадчыну?***

— Спачатку здавалася, што мой бацька прадоўжыць род хлебаробаў. Ён рана навучыўся касіць і араць, малаціць і сеяць. Умеў абыходзіцца з канём, караваю. Аднак душа яго цягнулася да іншага. Змайстраваўшы дудачку, падбіраў на ёй галасы птушак, выводзіў мелодыі, якія гучалі тады на вясковых вяселлях, танцавальных вечарах.

Лукаш, ягоны бацька, бачыў гэтае захапленне сына, але не заміналў яму. Адшкадаваўшы немалыя грошы, купіў нават сапраўдную скрыпку, адвёз сына за рэчку Чарняўку, у вёску Заботы — да Сідаравых хлопцаў, каб навучылі Мішу іграць на гэтым няпростым інструменце. І кемлівы, таленавіты юнак так авалодаў скрыпкаю, што погаласка пра музыку-самавуку дайшла ажно да дзядзькі Галубка. І той запрасіў яго працаваць разам.

***— А маці ваша мела якое-небудзь дачыненне да тэатра, да мастацтва наогул?***

— Ніякага.

***— Дык як жа яны пазнаёміліся, калі жылі далёка адно ад аднаго?***

— Пазнаёміліся падчас гастроляў тэатра ў Крупскім раёне, дзе Аляксандра Герасімаўна працавала настаўніцай. Яна ўжо скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт, прырodазнаўчае аддзяленне, і мела адпаведны дыплом. Тады гэта было вялікай рэдкасцю — універсітэцкая адукацыя. Таму, відаць, простаму сялянскаму хлопцу, скрыпачу-самавуку складана было заваяваць сэрца адукаванай дваранкі. Аднак жа неяк заваяваў!

У энцыклапедыі вы можаце прачытаць, што я нарадзіўся ў Мар'інай Горцы, гэта — няпраўда. Нарадзіўся я ў Мінску, але пражыў у ім усяго трыццаць восем дзён. Справа ў тым, што па заканчэнні медінстытута мой бацька Міхаіл Лукіч атрымаў накіраванне ў Магілёўскую псіхіятрычную бальніцу.

Псіхбальніца знаходзілася на ўскраіне Магілёва, у пасёлку Пячэрск. Нашу сям'ю пасялілі тут жа, на тэрыторыі бальніцы, у асобным цагляным доме. Па праўдзе кажучы, жыццё тут, за бетоннай сцяной, сярод душэўнахворых людзей давалася бацьку нялёгка. Ды і нам з сястрой не было асабліва куды выйсці, пагуляць.

Скарыстаўшыся тым, што дачцэ трэба было ісці ў першы клас, а ў Пячэрску школы не мелася, і што жонцы-настаўніцы таксама няма работы, Міхаіл Лукіч стаў прасіцца, каб яго перавялі ў любую бальніцу Магілёва. І летам 1940 года мы пераехалі. Пасяліліся ў доме чыгуначнікаў на Першамайскай вуліцы. Сястра пайшла ў школу, а бацька стаў працаваць на трыццатым урачэбным участку станцыі Магілёў.

Ды радасць наша была кароткай. Мне не споўнілася і тры гады, калі пачалася вайна.

***— Ігар Міхайлавіч, а вы тое ліхалецце крыху памятаеце? Як склаўся лёс вашай сям'і з пачаткам вайны?***

— Я тады, хоць і маленькі быў, памятаю адзін эпізод. Мы некуды беглі, вакол нас узрываліся снарады. Раптам у маім чаравіку развязаўся шнурок. Мы прыпыніліся, каб яго завязаць. І тут наперадзе ўзарвалася бомба. Калі б мы працягвалі бегчы, нас бы накрыла...

Яшчэ помню, як начавалі ў лесе паблізу Пячэрска. Мы — мама, сястра Ларыса і я — уцяклі туды з Магілёва, калі немцы ўжо бамбілі. Бацьку мабілізавалі крыху раней. Перад самай вайной ён скончыў трохмесячныя курсы і атрымаў званне ваенурача 3-га рангу. З пачаткам вайны яго прызвалі на службу. На шчасце, яму яшчэ ўдалося ўзяць дазвол на эвакуацыю сям'і. У тыя дні якраз фарміраваўся новы эшалон на ўсход. Мы паспелі трапіць на гэты цягнік. Даехалі да станцыі Марозаўская, гэта пад Сталінградам. А пасля пераехалі ў Сальск, куды бацьку накіравалі на работу.

Часам было вельмі страшна, асабліва калі побач узрываліся снарады, калі на маіх вачах гінулі людзі. Няпроста было перажыць холад і голад. Але дзяцінства ёсць дзяцінства. Помню, мы, хлапчукі, злавілі ў полі зайчыка. Пушысценькі такі, шэранькі, цёплы. Ён галодны, і мы таксама. Але гулялі разам, не пакрыўдзілі звярка.

...А ў ліпені 1946 года мы зноў садзіліся ў таварняк, і за нашым вагонам беглі мае аднакласнікі з чыгуначнай школы нумар дзевяць і махалі мне на развітанне. Наперадзе ў мяне была сустрэча з роднай Беларуссю, якую я мала ведаў, але якая вабіла мяне.

Сышлі мы на станцыі Пухавічы. У Мар'інай Горцы я пайшоў у другі клас, а калі скончыў пяты, бацькі вырашылі аддаць мяне вучыцца музыцы. Прафесійна. Да гэтага я займаўся фактычна самастойна. У мяне быў акардэон-чвэрць, цымбалы і яшчэ стаяла ў доме чорнае шыкоўнае піяніна, якое бацька купіў у некага з мар'інагорцаў. Першыя ўрокі музычнай граматы мне даў бацька. А пасля я крыху наведваў самадзейныя занятку, якія вяла наша суседка Ганна Генадзеўна.

Але бацькі палічылі, што гэтага мала, каб стаць сапраўдным музыкантам. У жніўні 1950 года мама прывезла мяне ў Мінск. Знайшлі плошчу Свабоды, музычнае вучылішча. Ішоў якраз набор навучэнцаў: у той год адкрываўся клас па цымбалах, і я ў ім аказаўся адным з першых вучняў.

## НАРАДЖЭННЕ ПЕСНІ

***— Ігар Міхайлавіч, дык вы, аказваецца, прафесійны цымбаліст?***

— А вы думалі!.. За тры гады я настолькі дасканала асвоіў гэты інструмент, што стаў адным з найлепшых вучняў у класе. Мяне нават здымалі для кіначасопіса «Навіны дня». А ў газеце «Советская Белоруссия» змясцілі здымак хлопчыка з цымбаламі, у піянерскім гальштуку. Гэта быў я! (*Смяецца.*)

Але ў дзявятым класе сур'ёзна захапіўся фартэпіяна. Да гэтага мяне падахвоціў піяніст Рыгор Шаршэўскі, за плячыма ў якога была Ленінградская кансерваторыя. Гэта ён адкрыў для мяне Чайкоўскага, Рахманінава, Скрабіна, Баха, Бетховена, Ліста, Шапэна, Пракоф'ева, Шастаковіча... А кампазітар Віктар Белы ўвёў мяне ў свет кампазіцыі.

***— А калі ж з віртуознага музыкі пачаў нараджацца таленавіты кампазітар?***

— Гэта адбылося не адразу. Мелодыі, якія час ад часу ўзнікалі, цепліліся ў маёй душы і раней, цяпер загучалі больш выразна, папрасіліся на паперу. Некаторыя з іх не захаваліся, але адна з іх гучыць і сёння. Гэта — «Песня пра Мінск» на словы народнага паэта Пімена Панчанкі.

***— Ігар Міхайлавіч, скажыце, калі ласка, а як наогул нараджаецца песня? Гэта доўгі, пакутлівы працэс ці, наадварот, імгненнае творчае азарэнне?***

— Бывае па-рознаму. Адна песня нараджаецца, як кажуць, за адзін прысест, выліваецца з душы адразу ўся ад пачатку да канца і не патрабуе пасля ні дапрацоўкі, ні шліфоўкі. А другая даецца цяжка, круціш яе і так, і гэтак, а ў ёй усё нешта не тое. І часам траціш не адзін дзень, а то і тыдзень, пакуль нарэшце не знойдзеш прымальнае рашэнне.

У песні галоўнае што? Мелодыя. А ў мелодыі ёсць інтанацыя, матыў. Некалькі гукаў — гэта матыў. Але аснова — мелодыя. Мне Бог даў мелодыю. Пакуль ёсць сілы, пакуль у маёй душы гучыць мелодыя, будуць нараджацца песні.

***— Калі да вас прыйшла больш шырокая вядомасць, першая ўсесаюзная слава?***

— Гэта здарылася 23 кастрычніка 1966 года. Тады ў Маскве праходзіў Усесаюзны конкурс на найлепшую савецкую песню, прысвечаны пяцідзесяцігоддзю Вялікага Кастрычніка. Дваццаць дзён на сцэне Маскоўскага тэатра эстрады гучалі песні, створаныя выдатнымі кампазітарамі. Прагучала на гэтым высокім форуме і мая «Памяць сэрца», напісаная на словы паэта-франтавіка Міхаіла Ясеня і выкананая тады яшчэ малавядомым спеваком Віктарам Вуячычам. Мы на вялікі поспех не разлічвалі — ужо сам факт удзелу ў такім прэстыжным конкурсе быў для нас немалой узнагародай.

Журы конкурсу ўзначальваў народны артыст Савецкага Саюза Леанід Уцёсаў. У яго складзе — спявачкі Клаўдзія Шульжэнка, Гелена Веліканава, кампазітары Ігар Шамо, Барыс Цярэнцьеў, Уладзімір Алоўнікаў...

І вось надышоў «судны дзень». Абвяшчаюць дыпламантаў — нас не назвалі. Агучылі імёны тых, хто заняў трэцяе месца. На жаль, не нашыя. Абвяшчаюць другую прэмію — міма. Раптам чуем: «Переможцами конкурсу сталі...» І гучаць нашы прозвішчы. Мы — найлепшыя!

Трапіць у кампанію такіх знакамітасцяў і стаць першымі — здавалася нечым неверагодным. Але гэта была сапраўдная перамога, прызнанне беларускай песні, яе аўтараў.

## СЯБРЫ, КАХАННЕ, СЯМ'Я

***— Ігар Міхайлавіч, давайце на заканчэнне пагаворым аб рэчах больш жыццёвых. І разам з тым прыемных. Скажам, аб каханні.***

— А вы лічыце, што каханне такая ўжо прыемная рэч? Я вось раскажу вам гісторыю. Пазнаёміўся я з дзяўчынай, вучаніцай суседняй школы. Звалі яе Вераніка.

Дзяўчына мне спадабалася. Мы сустракаліся ўсю вясну. А на лета Вераніка паехала да бабулі на Магілёўшчыну. Не вытрымаўшы расстання, я кінуўся да сваёй каханай, у далёкую, незнаёмую мне вёску Зарэсце. Знайшоў Вераніку, а яна не абрадавалася, а чамусьці спалохалася: «Навошта прыехаў? Што людзі скажуць?..» І збегла ад мяне. Можаце ўявіць сабе мой стан, калі я, абражаны ў сваіх найлепшых пачуццях, фізічна і маральна раздаўлены, вяртаўся на перакладных назад у Мінск.

А неўзабаве Вераніка пазнаёмілася з маладым афіцэрам і выйшла за яго замуж. Такое вось было ў мяне першае каханне. Не скажу, што яно сталася дужа прыемным.

Увогуле, мне ў гэтым плане ў юнацтве не шанцавала. Толькі пазнаёмлюся з дзяўчынай, павяду душэўныя размовы пра музыку, пра зоркі, а тут — бац! — з'яўляецца нехта больш рашучы і адбівае маю дзяўчыну. І я зноў перажываю, пакутую...

***— Як жа вам удалося паланіць сваю цяперашнюю жонку?***

— Напэўна, таму што Бог паслаў мне нарэшце маю сапраўдную палавінку. Тое, што Саша — мой лёс, я зразумеў з першай сустрэчы. А пазнаёміўся з ёю ў Пухавічах, куды яна прыехала ў Дом адпачынку. У нас аказалася шмат агульных інтарэсаў: Саша вучылася ў Брэсцкім музычным вучылішчы, я — у Ленінградскай кансерваторыі. Мы гаварылі і не маглі нагаварыцца. Упершыню я адчуў, якое гэта шчасце — адчуваць узаемнасць пачуццяў, роднасць душ.

А праз нейкі час вырашылі пажаніцца. Распісаліся ў загсе, і я прывёў сваю маладую жонку ў невялічкі пакойчык дома па вуліцы Фрунзэ. Праўда, мядовы месяц мы правялі ў бацькоўскім доме ў Пухавічах.

З таго часу мы з Сашай разам. Сёлета ў жніўні адзначылі залаты юбілей. За гэтыя паўвека мая верная спадарожніца праехала са мною па гарадах і вёсках дзясяткі тысяч кіламетраў, пабывала на ўсіх маіх аўтарскіх канцэртах у Беларусі, Маскве, Санкт-Пецярбургу, Кіеве, у многіх краінах свету. Перапісала сотні кілаграмаў нот. Прапусціла праз сваё сэрца ўсе мае радасці і беды.

Я ўдзячны сваёй жонцы, што яна была і застаецца галоўнай апорай у маім жыцці. Гэта яна, мая Саша, натхніла мяне на мае найлепшыя песні — «Алеся», «Вераніка», «Зачараваная» і г. д. Яна — першы слухач кожнай маёй новай песні і першы, самы патрабавальны крытык, а часам і першы выканаўца пад мой акампанемент.

***— Ігар Міхайлавіч, вы можаце сказаць, што пражылі шчаслівае жыццё?***

— І так, і не. Я шчаслівы ў тым, што маю добрую сям'ю, што мае песні любяць і спяваюць у народзе. Але я пражыў няпростае жыццё. Многае перажыў. У мяне было тры клінічныя смерці. І вось нядаўна перанёс дзве не зусім удалыя аперацыі, у выніку чаго вымушаны хадзіць з кіёчкам. Розныя людзі мне прычынілі шмат зла. Але не будзем аб гэтым. Я па-ранейшаму пішу песні, маю шмат творчых планаў. Я яшчэ ў страі. У поўным страі!

***

...На жаль, праз два гады пасля гэтай гутаркі, 12 лістапада 2018 года Беларусь развітвалася з сваім сынам. У Дом афіцэраў, дзе праходзіў жалобны мітынг, несканчона цякла людская рака. Ігар Міхайлавіч Лучанок сышоў у вечнасць.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

Юрый НЕСЦЯРУК:

# «НІБЫТА БАЧЫЎ СЯБЕ Ў КОЛЕ ЧАСУ»

**«Вось бы хустку з такім прынтам!» — захаплялася адна знаёмая на выстаўцы. Дзіва дзіўнае: даму з бамонду ўразіў твор серыі «Вясковы супрэматызм» магілёўскага мастака Юрыя Несцерука. Творы з гэтай і яшчэ адной серыі можна паглядзець у мінскай галерэі «Высокае места»: аўтар нібыта гуляе з пазнавальнымі рэчамі, з'явамі, формамі, нават датамі. І ўпісвае ўсё ў сучасны кантэкст, дзякуючы чаму знаёмыя старыя рэчы набываюць новы сэнс, адчуваеш іх асаблівую каштоўнасць. Той выпадак, калі фармальны падыход у мастацтве дапамагае зразумець: традыцыя не павінна быць страчана, а беларушчына глыбока пранікае і захоўваецца ў мастацкіх вобразах. Якім чынам гэта атрымліваецца, спыталі ў аўтара, які вядомы аматарам мастацтва па ўдзелу ў шматлікіх праектах:**

— Я сын настаўніцы пачатковых класаў і малявання, мы жылі ў Стоўбцах, — расказвае мастак. — Наша сям'я была рускамоўная, а ў школе, калі пачалі вывучаць беларускую мову, я стаў прасіць маму, каб мяне вызвалілі ад гэтых урокаў, бо дзецям ваенных тады дазвалялася не вучыць, маўляў, сёння яны жывуць тут, а заўтра могуць апынуцца недзе далёка. Але мама сказала: трэба вучыць, мова не абцяжарыць жыццё, а веды лішнімі не бываюць. Я не стаў адварочвацца ад заняткаў, а пасля аказалася, што ў нас вельмі вясёлая настаўніца Галіна Іванаўна. Было цікава даведвацца новыя словы. Я адчуў, што гэта ўсё аднекуль разумею. А калі паступіў у рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве ў Мінску, у нас быў вельмі харошы настаўнік беларускай мовы Барыс Іванавіч Жанчак. Ён вёў заняткі нефармальна, умеў зацікавіць і заінтрыгаваць. Неяк ён нам прачытаў верш Максіма Багдановіча «Як Базыль у паходзе канаў» — у мяне і сёння слёзы выступаюць, калі ўспамінаю... Беларусь і беларуская мова пачала мяне цікавіць, захапляць, уваходзіць у жыццё. У інстытуце — цяпер акадэмія мастацтваў — гэта было ўжо больш асэнсавана. І выкладчыкі ў нас былі цудоўныя. Напрыклад, Міхась Фёдаравіч Раманюк. А тут якраз у 1980-х гадах пачала адкрывацца беларуская гісторыя. Памятаю, праходзіла выстаўка «Мікола Гусоўскі і яго час» — а мы яго тады нават не вывучалі. Вось так пакрысе нешта пачынаеш разумець. Бачыш у музеях, якія былі рыцары ў даспехах — і гэта ўсё тут, а не ў нейкіх казачных краінах. Хацелася вывучаць усё больш глыбока.

Нас Раманюк так настроіў. Калі мы былі на першым курсе, паехалі ў канцы навучальнага года на практыку на Браслаўскія азёры. Знаёміліся з вяскоўцамі, знаходзілі ў людзей адметныя этнічныя рэчы, сабралі і прывезлі пасля цэлую машыну — народнае пляценне, колькі ручнікоў... Усё здалі ў фонды акадэміі, пасля малявалі гэтыя рэчы. Даўно было, але дагэтуль знаходжу натхненне ў гэтым...

***— Злучыць этна з кірункам, што заснаваў Малевіч, — нечаканы падыход. Здаецца, яны з розных сусветаў...***

— Вядома, калі вучыліся ў школе, то мы не ведалі ні Малевіча, ні супрэматызм. Тады толькі пачалі адкрываецца імпрэсіяністы — мы ўсе былі захопленыя. А ўжо ў інстытуце даведаўся пра супрэматызм. Мяне гэтыя квадрацікі забаўлялі. Атрымлівалася іх цікава раскласці ў прасторы. А ў манументальным мастацтве гэта наогул важна. Асноўная праблема пабудовы жывапісу ці мазаікі на сцяне ў тым, каб пакласці яе на нейкія рытмы. А прынцыпы супрэматызму дапамагаюць у вырашэнні.

Дарэчы, калі я выставіў першы раз у Мінску твор з серыі «Вясковы супрэматызм», на якім быў андарак, калегі паставіліся скептычна. Мая першая работа была больш фармальнай, чым тая, якую можна бачыць цяпер на выстаўцы (ужо гэтага года) — на ёй андарак больш натуральны. Якраз тады быў конкурс «Нацыянальная прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва». Я падаў той твор у катэгорыі жывапісу. Зразумела, сярод рэалістычных работ ён глядзеўся дзіка. Такія чуў кпіны, маўляў, давайце яшчэ выставім як мастацтва ўзоры на андараку... Дык а чаму і не ўзоры на андараку?.. Той жа грэчаскі меандр ужо стылізавалі і выкарыстоўваюць па патрэбах — у архітэктуры, на посудзе, на адзенні. Ды і ўзоры на андараках дзівосныя — такая музыка ў іх! Тым больш што народная вышыўка крыжыкам, калі паглядзець, гэта як нейкія сучасныя пікселі. Як толькі з'явіўся камп'ютар, я задумаўся: гэта ж прынцып, згодна з якім ствараецца вышыўка, — драбленне на элементы. Нібыта шыфр: адзін крыжык робіш, другі прапускаеш — і нейкія кампазіцыі ўзнікаюць. Калісьці ўсе гэтыя ўзоры маглі несці інфармацыю пра паходжанне чалавека: адкуль, якая мясцовасць... Гэта я цяпер кажу не тое каб дакладную інфармацыю, але мне так уяўляецца. Адчуваю, што ёсць тут нейкая сувязь.

Справа ў тым, што мы часта думаем, быццам некаторыя з'явы і падзеі здараюцца выпадкова. Нібы няма нідзе ніякай сувязі. Але тая канцылярыя, што зверху, робіць свае нябачныя справы, якія мы потым разгадваем, і аб'ядноўвае розных людзей. Ці наадварот, можа іх раз-



весці па розных кутках. Мы можам нават і не здагадвацца, якія сувязі існуюць паміж вельмі далёкімі, як нам здаецца, з'явамі. Мне здаецца, што Малевіч шмат якія ідэі падглядзеў у народнай творчасці. Гэта важная частка ў маім жыцці. Быў час, калі ў маім мастацтве былі тэмы, не звязаныя з беларускай гісторыяй. Тады было сумна і нецікава...

***— А ў чым была цікавасць ствараць твор жывапісу з адных дат?***

— Калі рабіў твор «500 гадоў. Успомніць усё», то разумеў, што азначаюць лічбы ў гісторыі Беларусі, пачынаючы ад 1517 года. А для мяне асабіста было важна, калі дайшоў да свайго года нараджэння: атрымліваецца, што я таксама трапіў у гэты кругаварот. Вось у школу пайшоў, вось скончыў інстытут ці жаніўся, дзіця нарадзілася... І зразумеў, што для мяне больш важны стаў не вынік, а працэс: нібыта бачыў сябе ў коле часу. Пасля пачаў удакладняць, што адбывалася ў тыя гады, пра якія ў мяне не было канкрэтных звестак. Тым больш сёння шмат новых матэрыялаў, якія прыадкрываюць таямніцы гісторыі.

***— У вас жа былі яшчэ гістарычныя серыі па замках...***

— Гісторыя мяне вельмі цікавіць. У нас у Магілёве ёсць краязнаўчы музей, вельмі харошы, я лічу. Зроблены, праўда, яшчэ за савецкім часам у асноўным ленінградскімі мастакамі. Але гэта сапраўдная расійская акадэмічная школа — там вельмі моцны малюнак, перспектыва ў паветры, яны стварылі адметныя дыярамы. Я з захапленнем глядзеў і вадзіў туды нашых мастакоў, якія прыязджалі ў Магілёў. І раптам аказалася, што я магу рабіць макеты — архітэктуры, замкаў. І рабіў — і Крычаўскага, і Быхаўскага. А каб зрабіць, ездзіў на месца, паглядзець, што там было на той момант. Мяне ўразіла, як будынак можа ператварыцца ў руіны. Па забытую гісторыю нагадвалі хіба што вежы... Тады я зрабіў серыю пра гэта. Яна цалкам рэалістычная.

Тут ёсць адзін нюанс, істотны для мастакоў: кожнаму важна знайсці сваю тэхніку і стылістыку, працаваць у ёй, адточваць. Вось той Быхаўскі замак у мяне быў рэалістычны. Але цяперашняя выстаўка ўжо фармальная. Некаторыя дзівяцца: а дзе ж ты сапраўдны? Там — такі, тут — іншы. Значыць, ты недзе хлусіш...

Але мастак можа мяняцца. Асабліва так бывае ў манументалістаў. Манументальнае мастацтва — гэта тое, што звязана з архітэктурай: сцены, фасады, вокны. Гэта вітражы, мазаіка і нават скульптура, якая існуе ў гарадской прасторы. І жывапіс ёсць манументальны — ён неабавязкова вялікі, можа быць і маленькі па памеры. Вось прыклад — Гаўрыла Харытонавіч Вашчанка, мастак-манументаліст, яго вітражы ёсць у Чырвоным касцёле. Як іх звязаць з рэалістычным, вельмі цёплым жывапісам Вашчанкі, для якога характэрны нацыянальны каларыт? Там адна тэхніка, адзін светапогляд, а тут — іншы, таму што такі запыт. Я кажу «запыт» не ў сэнсе аплаты, бо і сам мастак можа сабе ставіць запыт — нейкі духоўны ці сацыяльны. Я думаю, што розныя запыты, што нараджаюцца ў галаве творцы, неабавязкова павінны быць у адной тэхналогіі, у адным прыёме. Таму я магу мяняцца, і ад гэтага не сорамна: раблю ўсё сумленна.

***— Але пры Вашчанку ў манументалістаў была наладжаная работа, былі заказы на такія творы. А як цяпер у вас?***

— Недзе з канца 1990-х я не займаюся манументальным мастацтвам. Бо змянілася сацыяльная фармацыя, і калі пры савецкай уладзе манументальнае мастацтва несла не толькі прыгажосць, але і пэўны змест, то цяпер шмат што інакш. Тады прымаўся нейкі аб'ект, і звярталіся да мастакоў, каб зрабілі прыгожа: тыя ж роспісы ці вітражы. Але Гаўрыла Харытонавіч у Доме настаўніка яшчэ за савецкім часам зрабіў пано «Асветнікі» — гэта не проста прыгожа, — ён уклаў сваю душу, далучыў гістарычны погляд. Вось манументальнае мастацтва ў дзеянні, калі прызначэнне аб'екта і яго аздабленне абсалютна супадаюць.

Калі я прыехаў у пачатку 1980-х гадоў у Магілёў, працаваў на камбінаце ад Беларускага саюза мастакоў. Цяпер яго ўжо не існуе — з эканамічных прычын. Але спачатку ў мяне было шмат работы ў вобласці, па раёнах. Як і ў маіх калег. Але прыйшоў еўрарамонт!.. Ён выціснуў і мае работы. Нідзе нічога не захавалася. Апошняя мазаіка заставалася на цэнтральнай паліклініцы горада, але сёлета ўсё закрылі італьянскай пліткай. Я стаяў і глядзеў, як яе зашываюць.

***— А каб зняць ды захаваць?..***

— Аднойчы мне патэлефанаваў адзін харошы чалавек з Інстытута ўдасканалення настаўнікаў у Магілёве. У мяне там быў вітраж з партрэтамі беларускіх асветнікаў — Скарыны, Гусоўскага, Цяпінскага, Купалы з Коласам. Мы ў Беларусі толькі пачыналі рабіць вітражы з роспісам па шкле, а раней рабілі без роспісу, больш фармальнага плана: складалі выяву з кавалачкаў, потым іх манціравалі. Ён патэлефанаваў, каб сказаць, што знялі мае вітражы і паставілі ў нейкай каморцы, дык, можа, я б забраў. А куды мне іх было падзець? Там жа было тры метры ў вышыню, хоць і з кавалачкаў. А ў мяне майстэрня на шостым паверсе, і няма дзе развярнуцца. І нічога не мог зрабіць...

Цяпер жа пры будаўніцтве выкарыстоўваюцца добрыя матэрыялы, шклопакеты, гіпсакардонавыя сцены. Іншыя прыёмы прыйшлі ў афармленне інтэр'ераў ці экстэр'ераў. І заказаў сёння няма. Праўда, робяць муралы, але мяне гэта ўжо не цікавіць. Работа манументаліста вельмі нервовая, бо шмат у чым залежыць ад іншых людзей. З усіх бакоў здараюцца неспадзяванкі: то машыну не далі, каб падвезці матэрыял, то няма пад'ёмнікаў для вялікай сцяны, то трэба смальту накалоць для мазаікі. А мастак усё перажывае. Як Кішчанка рабіў свае грандыёзныя мазаікі — цяжка нават уявіць...

***— Цяпер працуеце як жывапісец?***

—Так. Па-першае, у канцы 1990-х зніклі заказы. Закрыўся наш камбінат. Ратавалі музеі — давалі цікавыя мне макеты замкаў, дыярамы. Для Магілёўскай ратушы я зрабіў тры дыярамы — з фігурамі, для якіх трэба прадумаць дакладнае гістарычнае адзенне. Мяне тое захапляла. Падабалася, што я ў тэме, бо добра вывучыў замкі: як яны будуюцца, як фарміруюцца абарончыя лініі, з якіх матэрыялаў, чым адрозніваліся пабудовы, што паўставалі на беларускіх землях, ад еўрапейскіх. Вучыўся на творах некаторых нашых мастакоў, глядзеў арыгінальныя музейныя экспанаты. У Парыжы музей Дома інвалідаў мне быў найбольш цікавы, таму што там ёсць усё, што датычыцца гісторыі арміі. Дарэчы, ёсць нават экспанаты радзівілаўскія па паходжанні. Мяне гэта захапіла. А такая ніша — маляваць на сценах — пустая не бывае. Вось з балончыкаў узяліся фарбаваць — хлопцы лічаць, што гэта ў іх добра атрымліваецца...

***— Калі шмат твораў у майстэрні, то іх жа трэба недзе паказваць...***

— У нас штогод праходзяць 1-2 абласныя выстаўкі, на якія мы прапаноўваем да трох твораў. Сёлета ў сакавіку ў мяне была персанальная выстаўка ў Полацкай галерэі. Выстаўляўся я двойчы ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, меў персанальную выстаўку ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. І ў Магілёве некалькі разоў рабіў персанальныя выстаўкі. Не ў тым задача, каб кожны раз рабіць персанальную. Назбіраюцца тэмы, творы — то добра. А калі мастак паказвае тое, што людзі бачылі раней, яны потым абураюцца: «А чаго мы прыйшлі?» Гэта эстрадныя спевакі ўсю дарогу могуць спяваць адны і тыя ж песні — усе толькі іх і чакаюць, колькі гадоў ні было б тым хітам. Але ў мастакоў такое не праходзіць: гледачы кожны раз чакаюць новых твораў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**





ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов:

## ООО «ТрастАудитКонсалт» (УНП 692017051),

222304, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14, тел. (8029) 777-91-61;

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре ликвидации будут проведены **18.08.2023 г. в 15.00** по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14.

Подробное содержание спецификаций к лотам размещено на сайте: **www.truster.by**

**Продавец: ООО «Феликсо» (УНП 192356085)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС, BYN |
|---|---|---|
| 1 | Рекламные вывески (14 наименований согласно специф. 1) | 1011,00 |
| 2 | Торговые стеллажи и оборудование (3 наименования согласно специф. 2) | 1560,00 |
| 3 | Мебель торговая (21 наименование согласно специф. 3) | 1340,00 |
| 4 | Компьютерная и аудиотехника (10 наименований согласно специф. 4) | 730,00 |
| 5 | Комплект торгового оборудования магазина «Физкульт» (Немига) (согласно специф. 5) | 3280,00 |
| 6 | Компьютерная техника и оборудование (9 наименований согласно специф. 6) | 2440,00 |
| 7 | Климатическое и торговое оборудование (7 наименований согласно специф. 7) | 770,00 |
| 8 | Комплект офисной мебели (7 наименований согласно специф. 8) | 1130,00 |
| 9 | Световой комплекс (согласно специф. 9) | 400,00 |
| 10 | Комплект торгового оборудования магазина «Физкульт» (Замок) (согласно специф. 10) | 3870,00 |
| 11 | А/м Volkswagen Caddy MAXI KASTEN 2015 г. в. (согласно специф. 11) | 15 300,00 |
| 12 | Климатическое оборудование и витрины (согласно специф. 12) | 1050,00 |
| | Местонахождение имущества: г. Минск, Долгиновский тракт, 51Б | |

**Продавец: ООО «Спорт Фьюжн» (УНП 192663122)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС, BYN |
|---|---|---|
| 13 | Стеклоизделия и мебель (9 наименований согласно специф. 13) | 417,00 |
| 14 | Компьютерная и бытовая техника (17 наименований согласно специф. 14) | 1420,00 |
| 15 | Рекламные вывески (7 наименований согласно специф. 15) | 1250,00 |
| 16 | Торговая мебель и оборудование (14 наименований согласно специф. 16) | 3840,00 |
| 17 | ПЭВМ и электрооборудование (12 наименований согласно специф. 17) | 3086,00 |
| 18 | Торговые манекены и оборудование (18 наименований согласно специф. 18) | 3460,00 |
| 19 | Вешалки торговые (согласно специф. 19) | 1040,00 |
| | Имущество б/у, местонахождение имущества: г. Минск, Долгиновский тракт, 51Б | |

**Продавец: ИООО «РСМТРАКС» (УНП 190632458)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС, BYN |
|---|---|---|
| 20 | Запчасти для грузовых автомобилей Renault, Volvo, JAC и др. (согласно специф. 20) | 26 540,00 |
| 21 | Офисная мебель (8 наименований согласно специф. 21) | 520,00 |
| 22 | Компьютерная техника (7 наименований согласно специф. 22) | 570,00 |
| 23 | Инструмент и оснастка для ремонта автотехники (18 наименований согласно специф. 23) | 2800,00 |
| 24 | Стеллажи универсальные (2 наименования согласно специф. 24) | 750,00 |
| | Местонахождение имущества: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14 | |

**Продавец: ООО «ИНФОРМАТЕК» (УНП 191768559)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС, BYN |
|---|---|---|
| 25 | Infilink XG 1000 Xm/5X 1000 Оконечная станция | 10000,00 |
| 26 | Комплект ЗИП для светодиодных экранов LWOWF5 и LWOWFD10: 8 модулей p10, 8 модулей p5, 4 блока питания, 2 приемные карты | 1400,00 |
| 27 | МФУ Kyocera | 150,00 |
| | Имущество б/у, местонахождение имущества: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14 | |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 7779161.

**Для участия в торгах необходимо в срок до 17.08.2023 15.00:**

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах по адресу: 222304, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14 либо на электронную почту info@truster.by; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY88UNBS3012 2173 7000 0000 0933 в ЗАО «БСБ БАНК», код UNBSBY2X, код BPSBBY2X, получатель – ООО «ТрастАудитКонсалт», УНП 692017051.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов.

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 14 календарных дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов, если иное не установлено договором. Извещения о ранее проведенных торгах – 08.02.2023, 27.02.2023, 14.04.2023, 12.06.2023.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ПМК № 187»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Багор пожарный, инв. № 909. Огнетушитель ОП-3, инв. № 1473. Огнетушитель ОП-4, инв. № 2239. Багор пожарный, инв. № 1184. Багор пожарный (2 шт.), инв. № 1185. Лом пожарный, инв. № 968. Ящик под песок, инв. № 100127829. Щит пожарный зак. нав., инв. № 926 | 103,30 | 10,33 | 5,16 |
| 2 | 8ПБ 13-1 (15 шт.), инв. № 1334; 8ПБ 16-1, инв. № 100127044; 8ПБ 19-3 (2 шт.), инв. 100127074; 9ПБ13-37 (7 шт.), инв. № 1067 | 62,98 | 6,30 | 3,15 |
| 3 | Рукав 32х43-1,6 (10 м.п.), инв. № 100131851. Рукав 38х55-3,92 ТУ 38 (60 м.п.), инв. № 100131856 | 566,40 | 56,64 | 28,32 |
| 4 | Провод ПНСВ 1*1,2 (330 м.), инв. № 8880. Прожектор РО-250 (4 шт.), инв. № 8364. Прожектор AYIA 250W (3 шт), инв. № 100126995. Эл. вентилятор (2 шт.), инв. № 100128625 | 420,96 | 42,10 | 21,05 |
| 5 | Строп 4СК-5,0/5000, инв. № 100126359. Строп 4СК-5,0/5250, инв. № 1501. Стропа 2СК-5,0/5250, инв. № 5792. Ящик каменщика ЯР-1,000 (2 шт.), инв. № 100126451 | 447,36 | 44,74 | 22,37 |
| 6 | Жалюзи (директор) 6,5 кв. м, инв. № 7723. Ковер 3*4 (директор), инв. № 7721. Печь микроволновая «Горизонт», инв. № 8070. Стул ISO BLACK 19 С-38 (2 шт.), инв. № 7667. Стул «Гольф», инв. 77563. Стол П232.41, инв. № 77562 | 255,12 | 25,51 | 12,76 |
| 7 | ВБ 2-28Н лев., инв. № 8775. Ворота металлические, инв. № 100132829. ДВ1ДЧ 23 21-10, инв. № 857. КСф 10-9, инв. № 1649. КСф 15,6, инв. № 100131381. ПН 20 м, инв. № 1226. Профиль прозрачный по 2,1 м (30 шт.), инв. № 100128947. Щиты из досок (8 шт.), инв. № 100132605. Щиты из фанеры (6,967 кв. м), инв. № 100130405. Печь дровяная, инв. № 7056 | 478,69 | 47,87 | 23,93 |
| 8 | Беседка для курения 1595914 (1. Шифер 3 стандартных листа. 2. Отлив металлический (мягкий) 2,8 м. 3. Доски (2,8 м – 3 шт., 1,15 м – 7 шт., 1,2 м – 4 шт., 2,2 м – 2 шт.). 4. Брусы 2,8 м – 2 шт. 5. Щиты (прямоугольные 1,4х1,05 – 2 шт., треугольные 1х0,35 – 2 шт., 1,05х0,85 – 2 шт.), инв. № 6294 | 60,48 | 6,05 | 3,02 |
| 9 | Строп ГУИЛ 484144.010-03,15 (2 шт.), инв. № 100128237 | 42,24 | 4,22 | 2,11 |
| 10 | Шкаф ЩР 11-8-4 (1 шт.), инв. 100129045 | 566,40 | 56,64 | 28,32 |
| 11 | Экскаватор ЕК-14-20, 2009 г. в., двигатель Д-245, дизель, мкпп, з.н. 3996, цвет желтый, пробег 3,6 т. км | 18 420,00 | 1842,00 | 921,00 |
| 12 | 1. Системный блок AMD 1,93 Ггц ОЗУ 512 Мб HDD 512 Гб, DVD. 2. Системный блок AMD Athlon 2 2,7 Ггц ОЗУ 1 Гб HDD 80 Гб, DVD. 3. Системный блок Pentium Dual 2,5 Ггц ОЗУ 2 Гб HDD 150 Гб DVD. 4. Системный блок Pentium Dual 2,5 Ггц ОЗУ 1,93 Гб HDD 320 Гб CD R. 5. Системный блок AMD Athlon 2 2,7 Ггц ОЗУ 1 Гб HDD 250 Гб, DVD. 6. Монитор FLATRON L1718S-SN. 7. Монитор FLATRON L1719S. 8. Монитор FLATRON L1742S. 9. Монитор FLATRON L1750U. 10. Монитор FLATRON L1751SQ. 11. Монитор FLATRON L1750SQ. 12. Принтер XEROX PHASER 3117. 13. Принтер XEROX PHASER 3117. 14. Принтер XEROX PHASER 3117. 15. Принтер SAMSUNG ML2010PR. 16. Принтер XEROX PHASER 3122 | 555,92 | 55,59 | 27,80 |
| 13 | 1. Мини-АТС, aria soho Digital Hybrid PABXforZOHO. 2. Набор мебели «Виктория Люкс 5». 3. Устройство термоперепleta UNIBIND XU 138. 4. Факсимильный аппарат Panasonic KX-FT 982RU. 5. Антенна СА-600, цифровой спутниковый ресивер GS 7300 | 411,00 | 41,10 | 20,55 |
| 14 | 1. Подмости инвен. Шарн.-панельн. ПШ-000 А (с настилом). 2. Сейф металлический. 3. Шкаф металлический для документов. 4. Шкаф металлический для одежды. 5. Бетоносмеситель, BWE 250K. 6. Бункер БП – 1,0 | 1681,62 | 168,16 | 84,08 |
| 15 | Отделочная станция 2М359 | 2332,20 | 233,22 | 116,61 |
| 16 | Станок ПРО-10 (правильно-отрезной станок) | 975,51 | 97,55 | 48,78 |
| 17 | Станок токарно-винторезный 1К62 | 1530,66 | 153,07 | 76,53 |
| 18 | Установка пуско-зарядная ENERGY1000 START 230-400 | 592,05 | 59,21 | 29,60 |
| 19 | 1. Захват 6 м. 2. Захват ГУИЛ.484135.009-001 | 1640,01 | 164,00 | 82,00 |

В отношении лотов №№ 1–10 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее объявление размещалось в газете «Звязда» № 98 (29978) от 25.05.2023, стр. 10, № 131 (30011) от 11.07.2023, стр. 4.

В отношении лотов №№ 11–19 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.** Ранее объявление размещалось в газете «Звязда» № 55 (29935) от 23.03.2023, стр. 11, № 87 (29967) от 10.05.2023, стр. 6, № 98 (29978) от 25.05.2023, стр. 10, № 112 (29992) от 14.06.2023, стр. 15, № 131 (30011) от 11.07.2023, стр. 4

**Местонахождение лотов №№ 1–19:** Минская область, г. Молодечно, ул. Т. Дудко, д. 10

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **18 августа 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 7 августа 2023 года до 16.00 16 августа 2023 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «ПМК № 187», проводимых 18.08.2023.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.

Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **Сергей Владимирович, +375296109357.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Передвижная механизированная колонна № 187», в лице ликвидатора – ООО «КАНО», тел.: 80173958917; +375293928906 (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 10)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – частного торгово-производственного унитарного предприятия «ИНСТИТУТ ЭНЕРГОСБЕРПРОЕКТ» (УНП 600126325, Минская обл., г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, д. 36)

***Дата и время проведения торгов*: 05 сентября 2023 года.** Начало – 10.00.

Заявки принимаются с 05 августа 2023 года по 03 сентября 2023 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

*Продавец:* **частное торгово-производственное унитарное предприятие «ИНСТИТУТ ЭНЕРГОСБЕРПРОЕКТ»** (УНП 600126325), в лице ликвидатора – директора ООО «Азимут-Консалт» Радченко К.И., тел. 8 (029) 156-86-96.

| № лота | Наименование лота | Кол-во, шт | Начальная цена, руб., без учета НДС | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 610/С-44730, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, д. 36, площадь – 1757,60 кв. м, назначение – административное здание, наименование – административное здание (свидетельство (удостоверение) № 610/724-1913 о государственной регистрации) | 1 | 147 000,00 | 5 % | 2 % |
| | Сведения о земельном участке: Кадастровый номер 620850100008000910, площадь – 0,3538 га, назначение – земельный участок для обслуживания и эксплуатации административного здания, (свидетельство (удостоверение) № 610/724-1913 о государственной регистрации), принадлежит на праве постоянного пользования | | | | |
| | Иные сведения: На дату проведения торгов имеется ограничение – действующие договоры аренды | | | | |

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 16.00 **03 сентября 2023 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16:00 03.09.2023 заявление на участие в торгах с приложением документов в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в редакции постановления Совмина от 12.07.2013 № 607), заключить с организатором торгов договор о задатке, заключить с организатором торгов соглашение об оплате вознаграждения организатора торгов. Место приема заявлений – г. Минск, ул. Нарочанская, д. 11-2, пом. 406. Телефон для ознакомления и осмотра лота +375 29 684 71 76 Яскевич Дмитрий Васильевич.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Шаг торгов 5 % от начальной цены лота. Задаток за участие в торгах 2 % от начальной цены лота.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 3 (три) дня до наступления даты проведения торгов.

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенного соглашения в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 10 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен продавцом.

Класныя навіны

# Пра школьны падручнік — з павагай!

**Нацыянальны інстытут адукацыі запрашае школьнікаў для ўдзелу ў творчай інтэрнэт-лабараторыі «Мой любімы падручнік». Для навучэнцаў гэта ўнікальная магчымасць паказаць важнасць школьнага падручніка і яго ролю ў жыцці чалавека, расказаць аб сваім любімым школьным падручніку, прапанаваць ідэі па афармленні і змесце вучэбных дапаможнікаў, а таксама выказаць падзяку аўтарам школьных падручнікаў.**




Інтэрнэт-лабараторыя ўключае наступныя намінацыі: «Мая вокладка для любімага падручніка», «Рэкламны лозунг аб любімым падручніку», «Закладка да любімага падручніка», «Мая старонка для любімага падручніка», «Відэаролік аб любімым падручніку», «ТОП-5 цікавых фактаў з любімага падручніка», «Лайфхак па рабоце з любімым падручнікам» і «Паштоўка-падзяка аўтару любімага падручніка».

Творчыя работы могуць быць прадстаўлены ў выглядзе відэароліка (любы даступны фармат), мастацкага праекта (малюнак, скульптура, жывапіс, графічны малюнак (чарцёж, эскіз, макет, 3D-рэндар), фатаграфіі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (пано, калаж з прыродных матэрыялаў, выраб з саломкі і тканіны, роспіс, разьба па дрэве, ганчарная работа), прэзентацыі (файл з расшырэннем PPT, PPS, PPTX, PPSX, PDF з максімальным аб'ёмам не больш за 10 Мб, максімальная колькасць слайдаў у прэзентацыі — не больш за дзесяць); тэксту, афармленага ў форме дакумента Word.

Мастацкі праект можа быць прадстаўлены ў электронным выглядзе ў фармаце JPEG (JPG), у выглядзе прэзентацыі ці відэароліка.

Да творчай работы неабходна прыкласці заяўку па ўстаноўленай форме, згоду на апрацоўку персанальных даных і адправіць на электронны адрас adumetod@adu.by з абавязковай пазнакай у тэме ліста «Мой любімы падручнік». Падрабязнасці можна знайсці на сайце НІА www.adu.by

Самыя цікавыя работы будуць апублікаваны на Нацыянальным адукацыйным партале, афіцыйных старонках партала ў сацыяльных сетках Facebook і «УКантакце».

Прыём заявак і творчых работ завяршаецца 24 верасня.

**Надзея НІКАЛАЕВА, фота аўтара.**

Сугучча

# «Сівую легенду» чытаюць па-ўзбекску

## У Ташкенце выйшаў пераклад гістарычнай аповесці Уладзіміра Караткевіча

«Сівая легенда» — гістарычная аповесць класіка беларускай літаратуры, якая ўпершыню пад назвай «Раман Ракута» была надрукавана ў беларускім часопісе «Полымя» ў красавіку 1961 года. Твор, які расказвае пра паўстанне сялян супраць феадальнага прыгнёту, твор, дзе гучыць пратэст супраць дэспатызму, жорсткасці, рэнэгацтва, здрады радзіме, даў назве кнізе аповесцяў У. Караткевіча «Сівая легенда», выдадзенай у 1981 годзе ў Маскве. Перакладчыкам твораў на рускую мову выступіла Валянціна Шчадрына. На дзесяць гадоў раней аповесць была надрукавана ў Ленінградзе, у 1971 годзе, у перакладзе Паўла Кабзарэўскага. І вось новы адрас падарожжа яркага, багатага на вобразы і сімвалы твора: па-ўзбекску «Сівая легенда» загучала са старонак літаратурна-мастацкага часопіса «Шарк Юлдузі», які выходзіць у Ташкенце.

Перакладчыца Караткевічава твора — вядомая ўзбекская пісьменніца Рысалат Хайдарава. Пераклад спярша планаваўся да публікацыі ва ўзбекскім часопісе «Жахон адабіёці» («Сусветная літаратура»), але ў выніку аповесць надрукавана ў часопісе «Шарк Юлдузі» («Звезда Востока»). У інтэрв'ю беларускім медыя некаторы час назад Р. Хайдарава заўважыла: «Нядаўна скончыла пераклад на ўзбекскую мову аповесці Уладзіміра Караткевіча «Сівая легенда». Вельмі ўразілі ідэя, форма і стыль аповеду. Караткевіч на высокай ноце апісаў бязмежную любоў і свабоду — я перакананая, што ўзбекскі чытач абавязкова павінен прачытаць гэты твор».

— У маіх планах і іншыя звароты да беларускай літаратуры з разлікам на пераклад найбольш адметных яе твораў на ўзбекскую мову, — гаворыць Рысалат Хайдарава. — Першая сустрэча з Караткевічам ва ўзбекскага чытача адбылася ў 1962 годзе. Менавіта тады ў калектыўным зборніку беларускіх паэтаў з'явіліся пераклады двух вершаў Уладзіміра Караткевіча, пераўвасобленыя на нашу мову легендарным Эркінам Вахідавым. Веру, што ў Ташкенце будзе выдадзена і асобная ўзбекская кніга класіка беларускай літаратуры.

**Кастусь ХАДЫКА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»,
210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: (0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.
**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебскоблресурсы»,
210034, Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 193А, тел.: (0212) 65-71-98, (0212) 65-71-70.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-49507 площадью 116,5 кв. м. по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное здание и магазин, назначение – здание многофункциональное.

Кап. строение с инв. № 200/С-49508 площадью 31,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – проходная, назначение – здание неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 200/С-49509 площадью 91,1 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: тамбур. Кап. строение с инв. № 200/С-49510 площадью 116,2 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – гараж и бытовка, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Кап. строение с инв. № 200/С-49511 площадью 280,0 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка. Кап. строение с инв. № 200/С-49512 площадью 2120,0 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – материальный склад № 1, 4, 6, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, навес, отдельная рампа, рампа. Кап. строение с инв. № 200/С-49513 площадью 1131,0 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад № 2, 3, 5, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка, рампа, навес.

Кап. строение с инв. № 200/С-59958 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 389,30 м, наименование – тепловая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап. строение с инв. № 200/С-106672 площадью 6470,0 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, благоустройство территории, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть, ограждение, трое ворот, бетонная площадка, три калитки, подпорная стена. Вышеуказанные объекты находятся на зем. участке с кадастровым № 240100000003000082 площадью 1,3306 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания универсальной оптовой базы (право постоянного пользования). Кап. строение с инв. № 200/С-59954 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 35,8 м, наименование – хозбытовая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-59955, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 426,45 м, наименование – электрическая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап. строение с инв. № 200/С-59956 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 57,85 м, наименование – водопроводная сеть, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Кап. строение с инв. № 200/С-59957 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 70,75 м, наименование – ливневая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства.

**Обременение:** договора аренды № 1/2015 от 02.02.2015 сроком по 31.12.2023, № 13-юр/3663 от 20.09.2022 сроком по 12.10.2023, № 14-юр от 01.11.2022 сроком по 31.10.2023, № 15-юр от 11.11.2022 сроком по 13.11.2023, № 16-юр от 29.11.2022 сроком по 05.12.2023, № 18-юр от 18.02.2023 сроком по 13.02.2024, № 19-юр от 10.05.2023 сроком по 01.06.2024, договор № 20-юр от 10.05.2023 сроком по 21.05.2024.

**Нач. цена: 590 864,25 бел. руб. с учетом НДС**.

Задаток: 59 086,42 бел. руб.

